ЦІКАВІНКІ З ПЕРАПІСКІ УЛАДЗІМІРА МУЛЯВІНА 9

ЯК БЕГЧЫ НЕКАЛЬКІ СУТАК І НЕ СТАМІЦЦА? 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЛЮТАГА 2019 г. СУБОТА № 22 (28889)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАЦЕГАЎ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу — начальнік упраўлення эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка:

«Нацбанк не прагназуе значнага змянення стаўкі рэфінансавання ў 2019 годзе. Ключавая задача рэгулятара на гэты год заключаецца ў зніжэнні інфляцыі. Мы паслядоўна ідзём да нашай сярэднетэрміновай мэты — 4 %. Па мінулым годзе наш арыенцір быў 6 %, пры гэтым мы былі нават некалькі ніжэй — інфляцыя склала 5,6 %. Сёлета паставілі сабе мэту 5 % і маем намер яе выканаць. Ёсць падставы гаварыць пра тое, што для гэтага не спатрэбіцца нейкіх экстраардынарных мер Нацыянальнага банка ў плане змены працэнтнай палітыкі. Таму, хутчэй за ўсё, калі казаць пра стаўку рэфінансавання, то чакаць, што мы кудысьці далёка сыдзем ад 10 % (у любы бок), не варта. Высокая імавернасць, што на канец года 10 % захаваецца».

ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ — РЭЧАІСНАСЦЬ

Учора Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях удасканалення сістэмы адукацыі

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што да гэтых пытанняў у нашай краіне звяртаюцца пастаянна.
«Я проста хачу перш за ўсё сам пераканацца, наколькі рэалізуюцца нашы рашэнні ў сферы адукацыі.
Калі ёсць неабходнасць, падштурхнуць рэформы па тэме», — сказаў ён.
На думку Прэзідэнта, у Беларусі неабходна ўдасканальваць тое, што маем.

СТАР. 2

Фота БелТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МАРАЗЫ ЧАКАЮЦЬ МАРАЗОЎ...

На вуліцы — адліга. А ў вёскі зімовая назва — Маразы! Патрапіўшы ў гэты куток Вілейшчыны, я не памыліўся: Маразы маляўніча раскінуліся на ўскрайку бору-лесу. Цішыня, спакой, прыгажосць у кожным дрэўцы, у кожнай елачцы! Вёска ўжо стала паселішчам дачнікаў, толькі адна сям'я застаецца тут зімаваць. Дзякуючы гэтай сям'і Маразы — жывыя!

СТАР. 5

Герой гэтага фотарэпартажу Уладзімір ФУРС са сваёй дзевяцігадовай унучкай Варварай у вёсцы Маразы.

КАРАТКА

- **Больш за 30 тысяч сем'яў Беларусі атрымалі безнаяўныя жыллёвыя субсідыі ў 2018 годзе.**
- У Брэсце ўчора адкрылі Цэнтр прафілактыкі па супрацьдзеянні наркаспажыванню сярод моладзі.
- **Страчаныя даспехі Радзівілаў вяртаюць на радзіму ў Нясвіж.**



- За стральбу па птушках жыхара Мінска аштрафавалі на Bуп765.

ISSN 1990 - 763X

Гасцёўня



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Зоя БЕЛАХВОСЦІК:

«З НАШАЙ ПРАФЕСІЯЙ МЫ ЎСЁ РОЎНА БАГАЦЕЙШЫЯ»

Актрыса, без якой блякне Купалаўскі і беларускі сучасны тэатр увогуле, атрымала званне народнай артысткі Беларусі, адыграла прэм'еру новенькага спектакля «Вешальнікі» і адкрыла для нашага інтэрв'ю дзверы сваёй грымёркі. Паходжанне з акцёрскай сям'і, больш за дзевяноста роляў у тэатры, выкананне Паўлінкі на працягу васямнаццаці гадоў, супрацоўніцтва з Мікалаем Пінігіным, выкладанне ў Акадэміі мастацтваў — Зоя Белахвосцік, між іншым жонка рэжысёра і мастацкага кіраўніка РТБД Аляксандра Гарцуева і маці актрысы Валянціны Гарцуевай, стала народнай і да афіцыйнага аб'яўлення.

СТАР. 8

ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ — РЭЧАІСНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Ламаць нічога нельга. У той жа час я не выключаю тое, што ў працэсе ўдасканалення сістэмы адукацыі на ўзроўні школьным, універсітэцкім нам прыйдзецца ад чагосьці адмовіцца. І, калі мы разумеем, што ад гэтага трэба адмовіцца, гэта трэба рабіць рашуча, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Самае галоўнае ў адукацыі, ды і наогул у эканоміцы, іншых пытаннях, — калі мы ведаем, што трэба рабіць, але з-за бюракратызму нашага махровага пачынаем зацягваць працэсы. Тады праходзіць час, і мы бачым, што тое, што трэба было рабіць учора, ужо непрымальна для сённяшняга дня, тым больш — заўтрашняга».

У такім выпадку атрымліваецца няпройдзены этап, упэўнены Аляксандр Лукашэнка. «І мы хапаемся за перадавое, а пад ім няма падмурка», — адзначыў ён. Таму ўсё трэба рабіць паступова, плаўна, пераходзіць ад меншага да большага, ад простага — да складанага.

Пра тэрміны навучання і практыку

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што раней ім былі прыняты пэўныя рашэнні, у прыватнасці аб скарачэнні тэрмінаў навучання па тых ці іншых дысцыплінах. Ён звярнуў увагу, што няма ніякай неабходнасці трымаць студэнта ў ВНУ, скажам, пяць гадоў, калі ён можа асвоіць патрэбную праграму для яго будучай дзейнасці за чатыры ці тры з паловай гады.

Акрамя таго, была дамоўленасць аб тым, што літаральна з першых курсаў універсітэта студэнта неабходна акунуць у практычную дзейнасць, з якой ён сутыкнецца пасля атрымання дыплома.

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што раней было агаворана, што навучальныя праграмы — ад школы да ўніверсітэта — памяняюць, прыбяруць усё лішняе і пакінуць толькі патрэбнае. Галоўны крытэрый — рэчаіснасць, якая будзе патрабаваць ад будучага спецыяліста навыкаў і ведаў.

Пра падручнікі

«Натуральна, абнаўляючы праграмы, асабліва ў школе, мы вымушаны будзем абнавіць падручнікі. Падручнік — гэта святое. Не ведаю, як вы да гэтага ставіцеся, але я, па сваёй адукацыі педагог, стаўлюся да падручніка як да іконы, нават у сучасным жыцці, калі кніжка не стала патрэбнай, надзённай для людзей», — сказаў Прэзідэнт.

Момант з падручнікамі датычыцца і ВНУ, аднак тут, на думку кіраўніка дзяржавы, ужо прасцей, бо студэнт павінен сам умець шукаць інфармацыю. Пры гэтым беларускі лідар упэўнены, што падручнік — гэта аснова, нават нягледзячы на наяўнасць інтэрнэту і іншых крыніц інфармацыі. Неабходна навучыць дзяцей шанаваць падручнік, аднак ён павінен быць якасным.

Пра экспарт адукацыі

Прэзідэнт нагадаў прысутным на нарадзе аб такой дамоўленасці: лік навучэнцаў павінен адпавядаць неабходнасці — не толькі эканомікі краіны, але і жыцця ў цэлым. «Гэта не датычыцца экспарту нашай адукацыі. Трэба навучаць замежнікаў і атрымліваць за гэта вялікія грошы», — дадаў Прэзідэнт.

Ён расказаў пра нядаўні запыт на навучанне замежных студэнтаў у Гродне, беларускаму боку былі гатовыя заплаціць добрыя грошы. Аднак пытанне застопарылася: не хапала інтэрната для замежных студэнтаў. На дадзены момант інтэрнат ужо будуецца. «Гэта добры экспарт, таму што сістэма беларускай адукацыі вельмі запатрабаваная. Па-мойму, 108 краін у нас навучаецца», — адзначыў беларускі лідар.

Пра бакалаўрыят і магістратуру

Паводле слоў Прэзідэнта, пра дзве ступені вышэйшай адукацыі было нямала гутарак. Першая — гэта бакалаўрыят, другая — магістратура.

«Я катэгарычна вам забараняю падобным чынам будаваць сістэму адукацыі. У нас сістэма адукацыі нармальная: чалавек скончыў ВНУ — ён атрымаў вышэйшую адукацыю, як мы з вамі, што знаходзяцца тут», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што не супраць магістратуры, але туды павінны ісці самыя здольныя студэнты, якія хочуць у перспектыве выкладаць і займацца навуковай працай.

Калі справа ў зарплаце педагогаў, якая залежыць ад колькасці гадзін, то неабходна павялічыць ім заробак. «Хай у яго будзе менш гадзін, ставак, але грошы пакінем тыя ж, яшчэ і дададзім», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што выкладчык не павінен увесь час хадзіць за студэнтамі — толькі частку дня трэба працаваць з імі, а астатні час прысвяціць самаадукацыі.

«Мы на прымальны ўзровень вывелі зарплату настаўнікам. А калі настаўнік яшчэ хоча зарабіць крыху больш, трэба варушыцца. Школа мае магчымасць даплаціць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Глядзіце, каб вы дашліфавалі зарплату. Нельга настаўніка крыўдзіць — гэта наша апора, гэта наша аснова, без настаўніка нічога быць не можа — ні сённяшняга дня, ні заўтрашняга».

Яшчэ Прэзідэнт звярнуў увагу на сітуацыі, калі на вытворчасцях выпускнікоў ВНУ даводзіцца перавучваць — гэта значыць, праца вышэйшай навучальнай установы аказваецца халастой. Адрыву ад жыцця не павінна быць.

Пра школьныя праграмы

На думку Аляксандра Лукашэнкі, складаная школьная праграма, напрыклад па матэматыцы, адпуджвае дзяцей ад вучобы. «Калі ты сутыкаешся з цяжкасцямі і не можаш іх пераадолець, рашаючы тую ці іншую задачу, разглядаючы тую ці іншую формулу, ты пачынаеш баяцца на пачатковым этапе, а потым ты наогул кідаеш гэтыя кніжкі, разумеючы, што ты ніколі гэта не асвоіш», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Добра, калі настаўнік зверне ўвагу на такое здарэнне і дапаможа, але гэтага можа і не адбыцца. Зыходзячы з вышэйвыкладзенага, Прэзідэнт заклікаў «рыхтаваць матэматыкаў на факультатыве». Аднак якасную аснову для чалавека, які вырашыць звязаць сваё жыццё з гэтым прадметам, павінны закласці ў ВНУ. Гэта значыць, не трэба перакідаць універсітэцкія праграмы ў школы. Такая сітуацыя ёсць і з іншымі дысцыплінамі.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад біялогію ў 8 класе, амаль палова курса якой прысвечана чарвякам. Ён зацікавіўся ў прысутных, навошта так скрупулёзна вывучаць гэту істоту, хоць і прызнаў, што ведаць пра гэта трэба. Безумоўна, калі вучань імкнецца звязаць сваю будучыню з біялогіяй, то гэта важная інфармацыя, але большасці наўрад ці спатрэбяцца вельмі падрабязныя звесткі.

Ён зноў падкрэсліў: у школе неабходна выкладаць тое, што патрэбна будзе заўтра для жыцця. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на працоўнае навучанне: якім чынам будуць фарміравацца сем'і, калі мужчына не можа ўкруціць лямпачку або ўбіць цвік? «Чаму мы на гэта забілі і нашым дзецям гэта не трэба? Чаму мы так ставімся да дзяцей? Чаму дзяўчынка не ведае, як смажыць яечню? Чаму яна гузік прышыць не можа?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Фізічнае выхаванне — па словах беларускага лідара, ёсць праблема: нават па мінімуме не атрымліваецца набраць у войска па-сапраўднаму здаровых дзяцей.

Пра фарміраванне грамадзянскай пазіцыі

Далей беларускі лідар адзначыў, што выхаванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі павінна прысутнічаць усюды — ад матэматыкі да гуманітарных дысцыплін. На яго думку, гэта дапаможа сфарміраваць грамадзянскую пазіцыю чалавека ў цэлым.

Што датычыцца адзінага дня інфармавання «Школы актыўнага грамадзяніна» (ШАГ), то Прэзідэнт справядліва адзначыў, што рашэнне ў кабінетах было прынята, а пра гатоўнасць настаўнікаў выкладаць такі кірунак не ўдакладнілі. Важна, каб у фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі таксама прымалі ўдзел сям'я і СМІ.

Дарэчы, крытыкаваліся і іншыя курсы, у тым ліку па асновах бяспекі жыццядзейнасці.

Пра кадры

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння вядзецца падрыхтоўка школьных настаўнікаў, але няма таго кантролю і патрабаванняў, якія былі калісьці. «Каб настаўнік ішоў і па-добраму дрыжаў за тое, каб прыйсці з ведамі і перадаць вучням», — сказаў беларускі лідар.

Што датычыцца выкладчыкаў у ВНУ, то, нават калі чалавек у салідным узросце, трэба ацэньваць яго працаздольнасць, падкрэсліў Прэзідэнт. Калі гэты паказчык застаецца на высокім узроўні, супрацоўніцтва трэба працягваць.

Прыватныя ВНУ, па словах беларускага лідара, калі яны не дацягваюць да стандарту, які выпрацаваны ў нашай краіне, то такія павінны быць зачынены неадкладна. «Калі хто-небудзь з прыватнікаў не зразумеў гэта, значыць, яго трэба прыводзіць да прытомнасці, — заявіў ён. — Мы не супраць прыватных ВНУ, але яны павінны працаваць не горш, чым дзяржаўныя. Трэба выконваць стандарт — той, які мы сёння выпрацавалі і маем».

Пра экзамены і тэсты

Прэзідэнт заклікаў яшчэ раз вярнуцца да пытання экзаменаў — пачынаючы са школы і заканчваючы ВНУ. «І канчаткова вызначыцца, зыходзячы нават не з меркавання выкладчыкаў, настаўнікаў, а зыходзячы з жыцця. Жыццё павінна быць галоўным крытэрыем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама беларускі лідар заклікаў вывучыць ЦТ: «Не заўсёды чыстае тэсціраванне можа даць уяўленне выкладчыкам, якія набіраюць у ВНУ абітурыентаў, пра жыццёвы ўзровень, веды, пра яго, галоўнае, здольнасці на будучыню».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Каментарый у тэму

У Беларусі будзе адзіны від магістратуры

Такую заяву па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы зрабіў міністр адукацыі Беларусі Ігар КАРПЕНКА.

«Да нядаўняга часу ў нас працавала два віды магістратуры — навукова-арыентаваная і практыка-арыентаваная. Зараз будзе адзін від магістратуры, які будзе накіраваны на падрыхтоўку навукова-арыентаваных спецыялістаў пад інавацыйныя канструктарскія распрацоўкі, а таксама пад педагагічную дзейнасць», — заявіў міністр.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўрасаюз запусціў механізм транзакцый з Іранам

Германія, Францыя і Брытанія стварылі кампанію, якая дазволіць, як яны лічаць, абысці санкцыі ЗША ў дачыненні да Ірана. Пра гэта было заяўлена на сустрэчы кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў гэтых краін, якая адбылася ў Бухарэсце. На думку міністра замежных спраў Францыі Жан-Іва Ле Дрыяна, «гэтая фірма дазволіць тым еўрапейскім кампаніям, якія хочуць захаваць бізнес-адносіны з Іранам, па-ранейшаму пастаўляць туды медыкаменты і прадукты харчавання, якія патрабуюцца народу краіны». Грошы за пастаўкі іранскай нафты будуць накіроўвацца не ў іранскія банкі, а з дапамогай гэтай фірмы-пасярэдніка тым еўрапейскім кампаніям, якія прадаюць у краіну тавары першай неабходнасці. Міністр замежных спраў Германіі Хайка Маас падкрэсліў, што «гэты крок закліканы прадэманстраваць у тым ліку і Ірану, што мы паранейшаму гатовыя выконваць нашу частку ўзятых на сябе абавязацельстваў і са свайго боку чакаем, што Іран таксама выканае свае».

Анамальныя маразы паралізавалі значную частку тэрыторыі ЗША

Наймацнейшыя маразы абрынуліся на значную частку тэрыторыі ЗША. Найбольш нізкія тэмпературы адзначаюцца на Сярэднім Захадзе краіны, дзе слупок тэрмометра апусціўся да мінус 30 градусаў па Цэльсію. Ад маразоў мацней за ўсё пацярпелі штаты Паўночная Дакота, Вісконсін, Аява, Мінесота, Мічыган і Ілінойс. У Чыкага тэмпература паветра дасягнула рэкордна нізкай адзнакі ў мінус 33 градусы, у Паўночнай Дакоце зафіксаваны мароз у мінус 37 градусаў. Як паведамляе USA Today, з-за непагадзі ў Штатах загінулі па меншай меры 12 чалавек. Вялікія снегапады на ўсходзе краіны выклікалі маштабныя ДТЗ. У многіх амерыканскіх гарадах закрыты школы, дзяржаўныя ўстановы і музеі. Грамадскі транспарт працуе з перабоямі, па шэрагу напрамкаў спынены чыгуначныя зносіны. У аэрапортах Сярэдняга Захаду былі адмененыя звыш дзвюх тысяч рэйсаў. Мясцовыя ўлады папярэдзілі, што надвор'е можа быць небяспечным для жыцця, і заклікалі амерыканцаў не пакідаць свае дамы. Упраўленне кадравай службы ЗША абвясціла, што з-за неспрыяльных умоў надвор'я федэральныя служачыя могуць прыходзіць на працу з трохгадзіннай затрымкай ці браць незапланаваныя адгулы. «Падобная інтэнсіўнасць [руху] халоднага паветра, я сказаў бы, здараецца раз на пакаленне», — заявіў супрацоўнік Нацыянальнай метэаралагічнай службы ЗША Джон Гаган. Па даных сіноптыкаў, у найбліжэйшы час маразы не адступяць, а наадварот, — узмоцняцца.

У Швейцарыі стварылі гутаперчавых робатаў-павукоў

Навукоўцы з Швейцарыі распрацавалі ўнікальнага гнуткага робата-павука, які зможа перамяшчацца ў сасудах чалавечага арганізма і дастаўляць прэпараты да праблемных участкаў. Прылада здольная літаральна змяняць свой агрэгатны стан, пераўтварацца ў практычна вадкую, а таксама рухацца на велізарнай хуткасці. Вядучы аўтар даследавання і дацэнт Політэхнічнай школы ў Лазане Сельман Сакар'я заявіў, што прататыпы робатаў маюць даўжыню каля міліметра, але іх можна паменшыць, выкарыстоўваючы метад складання, заснаваны на прынцыпе арыгамі.

Распрацоўка выканана з нанакампазітнага гідрагелю, які можа змяняць форму пад уздзеяннем электрамагнетызму. Акрамя таго, у прылады ёсць магчымасць праграмавання, дзякуючы чаму яна здольная арыентавацца без датчыкаў і трансфармавацца найбольш эфектыўным спосабам. Гэта дазволіць робату самастойна перамяшчацца па арганізме хворага праз патокі вадкасцяў, паведамляе Al-Mayadeen.

Чытач — газета

Не май сто рублёў...

Звяздоўцы — людзі добразычлівыя: убачыўшы на сваім паверсе гасцей (каб не казаць чужых), як правіла, вітаюцца, прапануюць дапамагчы — знайсці патрэбны кабінет, чалавека... Хоць прымаецца гэта і не заўжды.
— Дзякуй... Мы самі, — пачулі, напрыклад, надоечы ад дзвюх прыгажунь, што хадзілі ад кабінета да кабінета, на дзвярах чытаючы прозвішчы.
«Мусіць, прыз забіраць прыехалі?» — здагадаліся гаспадары.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Як высветлілася — не толькі. Галіне Уладзіміраўне Ціханенцы з Чашнікаў, падпісчыцы «Звязды» з амаль трыццацігадовым «стажам», і яе дачцэ Таццяне, якая выросла з гэтай газетай, проста цікава было прайсціся па калідоры, паглядзець, за якімі дзвярыма пішуцца навіны, дзе нараджаецца «Сямейная газета» і «Краіна здароўя», дзе кабінет Алены Ляўковіч, дзе, нарэшце, той «провад», на якім гадамі збіраецца народ...

Цікавая там выйшла размова, падчас якой высветлілася, што Галіна Уладзіміраўна ўважліва адсочвае «перамяшчэнне» звяздоўскіх рубрык і кадраў, то-бок ведае, што (канкрэтна) на старонках нядаўна з'явілася, а што чамусьці знікла, хто з нашых супрацоўнікаў сышоў, а хто ўладкаваўся на працу. Само сабою — хто ажаніўся (была віншаванка), хто каго нарадзіў, куды з'ездзіў, адзначыў юбілей...

З фотакарэспандэнтам Яўгенам Пясецкім падчас адной з камандзіровак яны, напрыклад, ужо сустракаліся, кніжку з «Простай мовай» маюць (другую — купілі ў той жа дзень), падпіску на газету аднойчы выйгравалі, а гадоў, можа, з дзесяць таму...

— Я, відаць, некаму падарунак зрабіць хацела, — спрабавала ўспомніць падпісчыца, — паклала ў канверт дзесяць долараў. А потым, забыўшыся, — туды ж звяздоўскі купон на розыгрыш прызоў — і ў рэдакцыю... Адтуль мне адразу ліст: маўляў, грошы вяртаем — як памылкова дасланыя... Тое пісьмо я дагэтуль захоўваю... І заўжды ўсміхаюся.

Трошкі радасці падарыў падпісчыцы і нядаўні розыгрыш прызоў, у якім Галіна Уладзіміраўна выйграла падарункавы сертыфікат універмага «Беларусь» на 100 рублёў. Казала:

— Не ведаю пакуль, што куплю... Пад'едзем туды, паходзім — нешта падбяром. У гэтым надзеі больш на Таццяну, на дачку.

У маці... І ў нас, здаецца, таксама, бо ў спадчыну ж павінна перадавацца не толькі знешнасць, але, дай бог, і павага — да роднай мовы, да газеты, якую некалі, пажаніўшыся, для сябе абралі бацькі.

Валянціна ДОЎНАР.

Меры бяспекі

Усе здарэнні — на неабсталяваных горках

За месяц у сталіцы 120 дзяцей атрымалі траўмы галавы падчас катання на цюбінгу

З пачатку года ў РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі паступіла 1050 дзяцей з чэрапна-мазгавымі траўмамі. З іх 120 — з цюбінгавымі траўмамі. Для параўнання: тых, хто пацярпеў падчас катання на санках, лядзянцы ці на нагах, у шэсць разоў менш — каля 20 чалавек.

— Усе траўмы адбыліся на спантанна сфарміраваных горках. Там, дзе катацца на цюбінгу забаронена катэгарычна: каля школ, у дварах, дзе прыпаркаваны аўтамабілі. Часта дзеці, 9—12 гадоў, ходзяць на горкі без суправаджэння дарослых, — заўважае **ўрач нейрахірургічнага аддзялення РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Аляксандр КОРАНЬ.**

Чаму колькасць такіх здарэнняў у гэтым сезоне значна выросла? Урачы называюць дзве прычыны: цюбінгі сталі больш папулярнымі, а матэрыялы, з якіх яны робяцца, больш якаснымі, за кошт чаго павялічваецца хуткасць руху па снезе.

Забараняць «ватрушкі» ніхто не збіраецца, але дзяцей і бацькоў заклікаюць выконваць меры бяспекі.

— Галоўнае — катацца на абсталяваных трасах. Бо спецыяльны схіл для цюбінга — гэта, як правіла, жолаб, там мінімальная імавернасць вылецець з трасы. І вугал нахілу гары не павінен перавышаць 20 градусаў, інакш будзе занадта вялікі разгон, — кажа **Намір АЛЬТАН, траўматолаг-артапед прыёмнага аддзялення траўматалогіі 6-й гарадской клінічнай бальніцы.** — Таксама трэба выкарыстоўваць цюбінгі, падыходзячыя па памеры. У вялікім дзіця не зможа трымацца за ручкі. Нельга спускацца паравозікам. А калі ўжо ідзяце на неабсталяваную горку, то трэба хаця б спачатку прайсціся ўздоўж, паглядзець, ці ёсць там якія няроўнасці, бо гэта адразу змяняе траекторыю руху цюбінга.

У Мінску камунальшчыкі праводзілі маніторынг усіх схілаў і горак у жыллёвай забудове. Аказалася, што амаль траціна з іх выкарыстоўваецца для катання, хоць абсалютна для гэтага не прызначаныя. Такія горкі пасыпалі пяском, каб папярэдзіць слізганне, на дошках інфармавання павесілі аб'явы, што з'язджаць на цюбінгу тут небяспечна.

Абсталяваць схілы ў жылым сектары сталіцы немагчыма: высокая шчыльнасць забудовы. Але спецыяльныя горкі для цюбінгу ў Мінску ёсць — напрыклад, побач з «Чыжоўка-Арэнай», у Шабанах. Бясплатныя абсталяваныя горкі для гэтай забавы з'явяцца і ў парку Уга Чавеса. Плануецца, што іх будзе дзве: для дзяцей малодшага і старэйшага ўзросту (апошняя — з больш крутымі схіламі).

На адным з прадпрыемстваў, дзе вырабляюць спортінвентар (у тым ліку і цюбінгі), задумваюцца, як зрабіць гэту прыладу для катання больш бяспечнай.

— Мы падрыхтавалі невялікую доследную партыю бяскамерных цюбінгаў — такія не выстраляць, калі раптам матэрыял парвецца. Каб паўплываць на хуткасць, можна зрабіць цюбінг набіўным, — расказвае **дырэктар прадпрыемства «Зубрава» Мікалай ШЫРОКІ.** — Але наша прадукцыя — кропля ў моры. Ёсць яшчэ шмат кітайскіх, іншых беларускіх вытворцаў.

Ён адзначае, што продажы цюбінгаў крыху знізіліся. Але звязвае гэта не з траўмамі, а з канкурэнцыяй на рынку: людзі набываюць больш танныя «ватрушкі» іншых прадпрыемстваў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ЭКАТВОРЧАСЦІ

У Крычаве адкрыюць Цэнтр экалагічнага і энергазберагальнага выхавання моладзі «ЭкаЭнергетыка». Аб гэтым на прэс-канферэнцыі расказала Валянціна ДЫНІЧ, намеснік старшыні асацыяцыі «БелБрэнд». Праект падтрыманы праграмай малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду ўпраўлення ААН па абслугоўванні праектаў (UNOPS) і рэалізуецца ад трох выканаўчых агенцтваў ГЭФ — Сусветнага банка, Праграмы па навакольным асяроддзі ААН і Праграмы развіцця ААН.

Цэнтр экалагічнай і энергазберагальнай асветы будзе працаваць як дэманстрацыйная, кансультацыйная і адукацыйная пляцоўка для забеспячэння інфармавання насельніцтва аб праблемах змянення клімату, аб магчымасцях змякчэння наступстваў гэтых змяненняў і аб неабходнасці ўкаранення энергазберагальных тэхналогій у паўсядзённае жыццё. Асаблівасцю праекта з'яўляецца выкарыстанне, прасоўванне і камерцыялізацыя экалагічных і энергазберагальных распрацовак беларускай моладзі. Валянціна Дыніч расказала, як гэта будзе ажыццяўляцца на практыцы:

— Цэнтр — гэта пляцоўка, дзе юныя навукоўцы могуць прэзентаваць свае навуковыя працы. Мы дадзім ім унікальную магчымасць прадэманстраваць свае распрацоўкі, дапаможам стварыць якасныя макеты, відэаролікі. Мы зробім усё, каб рэалізаваць іх ідэі: дапаможам знайсці спонсараў, годна прадставіць работы. Па сутнасці, гэта вялізная выстаўка маладзёжных інавацыйных праектаў, якую можна будзе наведваць пастаянна, бачыць, як развіваюцца ідэі, якіх поспехаў дамагаюцца іх распрацоўшчыкі, нават паўдзельнічаць у некаторых праектах.

Акрамя пераможцаў праектаў выставак «100 ідэй для Беларусі», «Найлепшы інавацыйны праект», «Найлепшы інавацыйны маладзёжны праект», у цэнтры будуць працаваць пляцоўкі, якія прадстаўляюць і асобныя праекты. Навучэнцы з Клецкага раёна Мінскай вобласці нядаўна прадставілі праект «Энергія з-пад абцасаў», у якім прапануюць абсталяваць крамныя каляскі акумулятарамі, якія будуць зараджацца ў працэсе «язды». Зарад, які будзе назапашвацца ў іх, можна будзе ўжываць для электрасілкавання розных прыбораў.

Пляцоўка будзе адкрыта на базе Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Крычава «Крэчут» прыкладна ў канцы вясны. **Дырэктар ДУА Юрый ЕЎДАКІМЕНКА** кажа:

— Толькі ў нашым цэнтры гурткі і секцыі наведваюць больш за 1400 навучэнцаў да 31 года. Новую пляцоўку змогуць наведваць і дэлегацыі з іншых рэгіёнаў, мы будзем рады і замежным гасцям. Праект павінен у корані змяніць светапогляд нашых людзей, асаблі-ва моладзі, прымусіць іх задумацца над многімі пытаннямі экалогіі і энергазберажэння, а гэта, у сваю чаргу, дапаможа забяспечыць краіне здаровую і жыццяздольную эканоміку.

Вольга ПРАЛЮК.

На слыху

На беларускі адбор на «Еўрабачанне» паступіла 113 заявак

Як адзначаюць у Белтэлерадыёкампаніі, якая выступае асноўным арганізатарам нацыянальнага адбору, гэта рэкордная колькасць за апошнія сем гадоў (напрыклад, летась ахвотных спяваць на еўрасцэне ад Беларусі было 93 чалавекі, а ў 2017-м — усяго 67).

Сёлета ж усяго за дзесяць дзён, што доўжыўся прыём, медыяхолдынг атрымаў 113 заявак. Улічваючы спрошчаную працэдуру афармлення (праз сайт) і адсутнасць абмежаванняў па грамадзянстве ўдзельнікаў, жаданне выступіць за Беларусь выказалі артысты не толькі з нашай краіны, але таксама з Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Румыніі, Італіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі, Швецыі, ЗША, Канады, Ізраіля і нават Нігерыі. Ёсць сярод іх даволі вядомыя выканаўцы — так, шведскі рок-спявак і гітарыст Себасцьян Рос праславіўся ў Паўночнай Еўропе як адзін з найлепшых выканаўцаў хітоў The Beatles, Міхай Трайстарыу з Румыніі ўжо выступаў на «Еўрабачанні» ў 2006-м і заняў 4-е месца ў фінале, Daz Sampson з Вялікабрытаніі таксама прадстаўляў родную краіну на шоу 2006 года. Хапае ў спісе і ўдзельнікаў мінулых адбораў — гурт «Аўра», Napoli, Ален Хіт, Анжаліка Пушнова і адна з патэнцыйных фаварытак адбору ЗЕНА — беларуская артыстка прадзюсарскага цэнтра Віктара Дробыша Зіна Купрыяновіч, якая летась нагадала аб сабе на дзіцячым «Еўрабачанні» — праўда, у якасці вядучай.

Пасля праверкі атрыманых заявак на адпаведнасць умовам конкурсу стане вядома, ці ўсе прэтэндэнты трапяць у наступны этап — жывое праслухоўванне. Яно пройдзе ў вялікай студыі Белтэлерадыёкампаніі ўжо ў панядзелак, 4 лютага, і па выніках праслухоўвання фокус-група абвесціць імёны дзесяці фіналістаў. Зрэшты, адзначаюць арганізатары, колькасць фіналістаў можа быць зменена ў той ці іншы бок, калі прафесіяналы палічаць гэта неабходным. Анлайн-трансляцыю праслухоўвання можна паглядзець на сайце www.tvr.by, а падрабязны рэпартаж пра тое, што застанецца па-за ўвагай тэлекамер, шукайце на сайце і ў адным з наступных нумароў «Звязды».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

КАЛЯ $70 млн

патрацілі беларусы на відэагульні ў 2018 годзе

У канцы студзеня даследчыкі кампаніі NewZoo абнавілі метадалогію ацэнкі індустрыі відэагульняў і абвясцілі новую статыстыку. Згодна з ёй, гадавы даход гэтага сегмента ў Беларусі за 2018 год склаў $69,3 млн. Гэта на 8 % больш, чым у 2017 годзе, калі беларусы патрацілі на відэагульні $64,2 млн.

У міжнародным спісе са 100 краін, жыхары якіх выдаткавалі на камп'ютарныя «цацкі» больш за ўсё грошай у 2018 годзе, Беларусь заняла 68-е месца і размясцілася паміж Сербіяй ($74 млн) і Пуэрта-Рыка ($67 млн). А вось ва Усходняй Еўропе наша краіна заняла 11-е месца, апярэдзваючы Харватыю ($60 млн) і Літву ($52 млн).

Адзінай галіной індустрыі, у якой зафіксавана зніжэнне даходу, з'яўляюцца браўзерныя (анлайнавыя) гульні. У параўнанні з 2017 годам прыбытак ад іх скараціўся на 6,1 %, а кансольныя (на гульнявых прыстаўках) гульні, наадварот, паказалі рост на 10 %. Таксама актыўна растуць даходы ад гульняў на смартфонах і планшэтах — на 9 % і 9,3 % адпаведна.

«Тэмпы росту індустрыі ў нашай краіне не саступаюць астатнім краінам Усходняй Еўропы, дзе сукупны даход ад відэагульняў таксама вырас у сярэднім на 8 % і склаў 3,8 мільярда долараў, — каментуе справаздачу Іван Жывіца, прадстаўнік мінскага цэнтра распрацоўкі кампаніі Wargaming. — Нязвыкла бачыць, што ў нас у краіне на першае месца па тэмпе росту выйшлі кансолі, нязначна апярэдзіўшы астатнія сегменты».

Найбольшай папулярнасцю ў нашай краіне карыстаецца гульня World of Tanks PC: на канец 2018 года было зарэгістравана больш за 2 млн уліковых запісаў.

НІШТО І НІХТО НЕ ЗАСТАНЕЦЦА ПА-ЗА ЎВАГАЙ

Як праходзіць падрыхтоўка да мультыспартыўнай падзеі за 140 дзён да старту

На гэтым тыдні пад кіраўніцтвам міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука завяршылася інспекцыя аб'ектаў, на якіх пройдуць спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў. Начальнік упраўлення па камунікацыях, сувязях з грамадскасцю і СМІ фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Аляксей Багдановіч расказаў, што падчас інспекцыі ўдзельнікі абмеркавалі самыя розныя пытанні, у тым ліку ўзаемадзеянне розных функцыянальных кірункаў, патокі на аб'ектах, розныя лагістычныя пытанні.

«Нам трэба зрабіць усё магчымае, каб спартсмены, балельшчыкі і журналісты былі ў камфортных умовах, — адзначыў Аляксей Мікалаевіч. — *Зараз будуць ліквідавацца шурпатасці, калегі будуць перамяшчацца непасрэдна на аб'екты, у красавіку фактычна яны ўжо будуць працаваць там. Два з паловай месяцы дастаткова, каб зразумець, як будзе функцыянаваць аб'ект. Па сутнасці, за 10 дзён мы правядзём 23 чэмпіянаты Еўропы».*

Студэнты не застануцца без жылля

Вёска спартсменаў афіцыйна адкрыецца 18 чэрвеня, аднак, пачаць засяленне члены спартыўных дэлегацый змогуць ужо з 15 чэрвеня. Вёска прыме больш за чатыры тысячы атлетаў і дзве тысячы членаў дэлегацый. Усе яны будуць жыць у студэнцкім комплексе ў межах праспекта Дзяржынскага і вуліцы Чурлёніса. *«Мы актыўна выкарыстоўваем вопыт правядзення аналагічных спаборніцтваў, I Еўрапейскіх гульняў і зімовай Алімпіяды ў Пхёнчхане,* — расказвае **менеджар «Вёскі спартсменаў» Андрэй ПАЛАВІНКІН.** — *Вёска атлетаў — гэта адзін з самых складаных аб'ектаў, паколькі ён пачынае функцыянаваць раней за ўсіх і завяршае функцыянаванне пазней за ўсіх. Мы адзіны аб'ект, які будзе працаваць 24 гадзіны ў суткі. Ёсць даволі шырокі пералік умоў, пазначаны арганізатарамі, мы прыкладаем усе намаганні, каб іх забяспечыць».*

Што ж будзе са студэнтамі, якія пражываюць там цяпер? Студэнты пяці вышэйшых навучальных устаноў пераедуць у іншыя інтэрнаты сваіх ВНУ або ў інтэрнаты іншых арганізацый і ўстаноў. **Начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Эдуард ТАМІЛЬЧЫК** адзначыў, што гэтая сітуацыя стаіць на кантролі ў Міндукацыі і рэктараў вышэйшых навучальных устаноў. *«Для таго каб стварыць найбольш камфортныя ўмовы для пражывання і навучання, праведзены шэраг арганізацыйных мерапрыемстваў па зрушэнні адукацыйнага працэсу. Так, шэраг студэнтаў будзе праходзіць вытворчую практыку па месцы жыхарства. Частка студэнтаў будзе пераведзена на дыстанцыйнае навучанне і будзе пражываць па месцы рэгістрацыі, асобныя студэнты да гэтага часу скончаць сваё навучанне».* Эдуард Тамільчык таксама падкрэсліў, што большасць студэнтаў разумеюць значнасць Еўрапейскіх гульняў для краіны, многія з іх самі прымуць удзел у правядзенні Гульняў у якасці валанцёраў.

Білеты прадаюцца

Білеты на Гульні ў Мінску паступілі ў продаж 1 снежня, цяпер яны даступныя на абсалютна ўсе сесіі, прадстаўлены ўсе цэнавыя катэгорыі. **Начальнік упраўлення па маркетынгу, камерцыйных пытаннях і рэкламе фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Максім КАШКАЛДА** адзначыў, што білеты з задавальненнем купляюць грамадзяне не толькі Беларусі, але і замежных краін. Пасля гаспадароў турніру самымі актыўнымі пакупнікамі былі расіяне. Затым ідуць балельшчыкі такіх краін, як Германія, Ізраіль, Літва і Польшча. Геаграфія продажаў — 28 краін. *«Чаму варта купіць білет на Гульні? Таму што гэта галоўная мультыспартыўная падзея Еўропы ў 2019 годзе. Па колькасці ўдзельнікаў і відаў спорту Гульні пераўзыходзяць зімовую Алімпіяду. Для параўнання, у зімовых Алімпійскіх гульнях удзельнічаюць дзве з паловай тысячы спартсменаў у 17 дысцыплінах, а Еўрапейскія гульні прымуць чатыры тысячы спартсменаў у 23 спартыўных дысцыплінах,* — тлумачыць Максім Кашкалда.

Агульная колькасць білетаў, даступная да продажу, складае не менш за 227 тысяч, 20 тысяч 350 ужо рэалізавана. *«У нас дастаткова добры прагрэс у продажах, больш за 5 тысяч рэалізавана праз афіцыйную пляцоўку ticketpro.by, 5 тысяч рэалізавана праз афіцыйнага рэсэлера ў Расіі, 1,7 тысячы — праз нашых афіцыйных турыстычных аператараў і агентаў, больш за 8 тысяч білетаў прададзена юрыдычным асобам і прадстаўнікам НАК краін-удзельніц».*

Цікава, што больш за 150 білетаў рэалізавана ў арабскіх краінах. Самымі папулярнымі сесіямі з'яўляюцца цырымоніі адкрыцця і закрыцця, на іх на сённяшні момант усяго рэалізавана больш за 25 % білетаў даступных для продажу. Самымі папулярнымі з спаборніцтваў з'яўляюцца лёгкая атлетыка, мастацкая гімнастыка і акрабатыка, пляжны футбол і каратэ. На гэтыя сесіі рэалізавана каля 30 % даступных білетаў. Важна адзначыць, што квіткі прадаюцца абсалютна на ўсе віды спорту.

Практычна на кожнай арэне будуць выступаць беларускія спартсмены, найлепшыя прадстаўнікі айчыннага спорту. Больш за тое, у Мінск прыедуць найлепшыя спартсмены Еўропы, у васьмі відах спорту будзе праведзена афіцыйная кваліфікацыя на летнія Алімпійскія гульні 2022 года, у чатырох відах спорту правядуць чэмпіянат Еўропы ў рамках II Еўрапейскіх гульняў. З 23 дысцыплін ні адзін з відаў спорту не прадстаўляе юніёрскую праграму.

Таксама Максім Кашкалда адзначыў, што Дырэкцыя ставіць на мэце паказаць Гульні на 160 тэрыторыях свету, на сённяшні момант 77 тэрыторый ужо зацверджаны. *«Мы актыўна рухаемся наперад і на міжнароднай арэне ў рэкламе, да канца лютага па «Еўраньюс» мы ўбачым першыя праграмы пра горад Мінск, яго славутасці і нашу культурную спадчыну».*

Дырэкцыя заключыла дагаворы з больш чым 20 афіцыйнымі ліцэнзіятамі і больш чым 20 харчовымі ліцэнзіятамі, якія ўжо ў пачатку сакавіка будуць гатовыя прадставіць сувенірную прадукцыю. *«Частка ліцэнзійнай прадукцыі ўжо паступіла ў продаж: кубкі, памятныя магніты. Правяралі попыт на сувенірную прадукцыю падчас чэмпіянату Еўропы па фігурным катанні ў Мінску. Гэтая прадукцыя карысталася павышаным попытам. Адзначу, сувеніры падчас II Еўрапейскіх гульняў плануецца прадаваць у 25 кропках вёскі атлетаў і чатырох фан-зонах Гульняў».*

Дарэчы, фан-зоны будуць размешчаны каля «Мінск-Арэны», «Чыжоўка-Арэны», па вуліцы Каст-рычніцкай, а галоўная фан-зона будзе знаходзіцца ў раёне Нямігі каля Палаца спорту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

БЯСПЕКА ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ пра стабільнасць, карупцыю і бяспеку на Еўрагульнях

Размова адбылася падчас падвядзення ў Магілёве вынікаў работы міліцыі за мінулы год. Міністр ахарактарызаваў сітуацыю ў Магілёўскай вобласці, як стабільную.

— Знізілася колькасць заяў у міліцыю ад насельніцтва аб злачынствах і правапарушэннях, менш стала правапарушэнняў, здзейсненых непаўналетнімі, у стане алкагольнага ап'янення, раней судзімымі асобамі, сямейна-бытавых канфліктаў. Больш эфектыўна вядзецца работа па канфіскацыі наркатычных і псіхатропных сродкаў, выяўленні злачынстваў у сферы эканомікі і высокіх тэхналогій. У цэлым узровень бяспекі на Магілёўшчыне дастаткова высокі. І гэта не толькі заслуга міліцыі, але і ўлады, якая забяспечвае адпаведную якасць жыцця, — адзначыў міністр.

У краіне ідзе мэтанакіраваная барацьба з карупцыяй. Перыядычна агучваюцца новыя фігуранты крымінальных спраў, але, як кажа Ігар Шуневіч, гэта сведчыць толькі аб празрыстасці сістэмы і вельмі высокую эфектыўнасць барацьбы з гэтым злом.

— Наша работа ацэнена міжнароднымі экспертамі ў тым ліку, — падкрэсліў ён. — Перамагчы карупцыю цалкам не магчыма, але зрабіць сітуацыю кіруемай, мы ў стане. У краіне створана вельмі эфектыўная заканадаўчая база, вырасла інфармаванасць насельніцтва, наладжаны ведамасны нагляд. Летась па сістэме органаў унутраных спраў каля 30 крымінальных спраў было распачата па заявах работнікаў — у асноўным яны датычыліся прапаноў хабару супрацоўнікам ДАІ. Пазалетась лічба была больш сціплай. Калі кіраўнікі ўсіх ведамстваў будуць зацікаўлены знішчыць карупцыю, эфектыўнасць барацьбы з ёй яшчэ больш павысіцца.

Міністр таксама пракаментаваў, як міліцыя збіраецца наладжваць бяспеку на сёлетніх II Еўрапейскіх гульнях:

— Вопыт вялікі, мы неаднаразова забяспечвалі парадак і грамадскую бяспеку на падобных мерапрыемствах, сіл і сродкаў у нас хапае. Прыцягваць кагосьці для ажыццяўлення праваахоўных функцый не збіраемся. У якасці эксперта ў нас магчыма з'яўленне прадстаўніка Інтэрпола або іншай праваахоўнай структуры. Мы гэта зараз абмяркоўваем. Але вялікай неабходнасці ў дапамозе збоку, паўтаруся, няма. Мы ў стане справіцца самі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«ГАРАЧЫ ЛЁД» СТУДЗЕНЬСКІХ ГОНАК

Роў матораў, небяспечныя віражы і кантактная барацьба на трэку — у мястэчку Баравая пад Мінскам прайшоў другі этап чэмпіянату Беларусі па зімовых трэкавых гонках «Гарачы лёд». Вопытныя спартсмены і юныя аматары хуткай язды з усёй краіны прыехалі на стадыён «Зара», каб вызначыць найлепшых у гонках на лёдзе.

Сярод удзельнікаў спаборніцтваў нямала вядомых гоншчыкаў, якія станавіліся прызёрамі шматлікіх турніраў. У шэрагу спарткараў можна было пабачыць і аўтамабіль Віталя Мурылёва, пераможцы «Калядных гонак — 2018». Акрамя дасведчаных спартсменаў, у заездах удзельнічалі і юніёры. Напрыклад, самаму малодшаму гоншчыку ледзьве споўнілася дванаццаць гадоў. Нароўні з брутальнымі мужчынамі на ледзяной трасе спрабавалі свае сілы прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва.

І вось дадзены старт пачатку спаборніцтва. Аўтамабілі рванулі наперад, пакідаючы за сабой ледзяны пыл, які вылятаў з-пад шыпаваных колаў. Ідучы ў рызыкоўныя заносы на паваротах дыстанцыі, гоншчыкі неаднойчы казыталі нервы гледачам небяспечным і маляўнічым відовішчам.

Другі этап спаборніцтваў скончыўся, але наперадзе яшчэ не адзін заезд чэмпіянату, а значыць, аматараў хуткай язды чакаюць вострыя ўражанні і новыя перамогі.

Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.

Важна!

НЕ ПРАПУСЦІЦЬ РАК

Летась у Беларусі выяўлена каля 52 тысяч новых выпадкаў раку, 17 тысяч пацыентаў памерлі. Паводле слоў спецыялістаў, смяротнасць ад анкалагічных хвароб будзе павялічвацца. Пры гэтым у Беларусі зацвярджаюцца новыя алгарытмы лячэння і з'яўляюцца новыя лекавыя сродкі. Толькі на закупку таргетных прэпаратаў сёлета з рэспубліканскага бюджэту будзе выдаткавана 50 мільёнаў долараў.

За апошнія пяць гадоў захваральнасць анкалагічнымі хваробамі ў Беларусі вырасла на 11 %, а смяротнасць — на 2 %. Пры гэтым сярод працаздольных захваральнасць павялічылася на 12 %, а смяротнасць знізілася на 4 %. Сёння ў Беларусі на дыспансерным уліку з анказахворваннямі стаіць больш за 300 тысяч чалавек. Больш за палову з іх (60 %) пераадолелі так званы 5-гадовы парог выжывальнасці.

— Штогод колькасць новых выпадкаў раку павялічваецца прыкладна на тысячу: у 2017 годзе выяўлена 51 тысяча, у 2018-м — 52, у 2019-м будзе каля 52 тысяч, — расказаў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ.** — Але своечасовая дыягностыка дае свае вынікі: у 2018 годзе на 1—2-й стадыях хвароба выяўлялася ў 67 % пацыентаў, у 2017-м — у 61 %.

Анколаг нагадаў, што для эфектыўнага лячэння крайне важна выявіць хваробу на 1—2-й стадыях. Калі лячэнне пачата пры першай стадыі, пяцігадовы парог выжывальнасці пераадольваюць амаль усе пацыенты, пры 2-й — 70—80 %, пры трэцяй — толькі палова, пры чацвёртай — усяго 5 %.

Сяргей Красны адзначыў, што самай распаўсюджанай лакалізацыяй у мужчын з'яўляецца рак прастаты, у жанчын — рак малочнай залозы. Пры гэтым заклікаў не палохацца, бо гэтыя віды пухлін і лечацца лепш за ўсё.

— Калі мець на ўвазе пацыентаў з ракам прастаты, то там такое паняцце, як 5-гадовы парог выжывальнасці нават не ўжываецца, бо амаль ўсе пацыенты пераадольваюць нават 10-гадовы рубеж. Тое ж датычыць і раку малочнай залозы, за выключэннем запушчаных і вельмі агрэсіўных пухлін, якія, на шчасце, не так часта сустракаюцца, — растлумачыў анколаг.

Сёння ў Беларусі паўсюдна ўкараняюцца скрынінгавыя праграмы па выяўленні раку чатырох найбольш распаўсюджаных у нас лакалізацый — раку прастаты, малочнай залозы, шыйкі маткі і коларэктальнай зоны. Скрынінг — абследаванне груп людзей, якія не маюць сімптомаў, для выяўлення хвароб.

— Ёсць яшчэ раёны, дзе мужчыны ва ўзросце ад 50 да 65 гадоў не маюць магчымасці здаць аналіз крыві на ПСА (прастатспецыфічны антыген). Але ў любым рэгіёне можна зрабіць яго на платнай аснове, ён каштуе ад 2 да 30 рублёў у залежнасці ад рэактываў, — звярнуў увагу Сяргей Красны. — На рак малочнай залозы правяраюць жанчын ва ўзросце ад 50 да 70 гадоў, робіцца рэнтгенмамаграфія. У некаторых нашых раёнах няма рэнтгенмамографаў, у такім выпадку можна звярнуцца ў раённую паліклініку і вам падкажуць, дзе можна прайсці гэта абследаванне. У больш маладым узросце эфектыўная УГД-дыягностыка.

Коларэктальны рак — адзін з самых распаўсюджаных у Беларусі. І ў 80 % выпадкаў яго можна папярэдзіць з дапамогай прафілактычнай каланаскапіі. Даследаванне робіцца пад анестэзіяй, і пры выяўленні паліпаў, якія ў будучым могуць весці да раку, яны выдаляюцца эндаскапічнымі метадамі. Пілотны праект па гэтым скрынінгу завершаны нядаўна.

— У больш чым паловы абследаваных пацыентаў ва ўзросце ад 45 да 70 гадоў знойдзены і выдалены паліпы. У 9 % выпадкаў праз 10—15 гадоў яны б перарадзіліся ў ракавыя пухліны. Усе выпадкі раку былі выяўлены на 1—2-й стадыях, паліпы выдалены эндаскапічна, без хіміятэрапіі і апраменьвання, — падкрэсліў Сяргей Красны.

Пакуль сітуацыя з коларэктальным ракам у Беларусі сумная — у 50 % выпадкаў ён выяўляецца на 3—4-й стадыях. Таму з 50, і нават з 45 гадоў пажадана раз у дзесяцігоддзе праходзіць татальную каланаскапію. Калі зрабіць яе хоць бы раз у жыцці, імавернасць узнікнення раку тоўстай кішкі змяншаецца на 60 %. Пакуль у Беларусі не ва ўсіх рэгіянальных медустановах ёсць магчымасць арганізаваць спецыяльныя кабінеты для гэтай працэдуры. Такім скрынінгам ахоплена ўсяго 5 % беларусаў, і раней, чым праз 10 гадоў, распаўсюдзіць яго на ўсю мэтавую групу наўрад ці ўдасца.

КАЛІ ДЫМ НЕ САЛОДКІ?

Антытытунёвы дэкрэт прыраўняе электронныя цыгарэты да тытунёвых вырабаў і яшчэ больш абмяжуе курэнне

Новы антытытунёвы дэкрэт, падпісаны Прэзідэнтам Беларусі 24 студзеня гэтага года, забароніць курэнне ў многіх грамадскіх месцах. Акрамя таго, на электронныя сістэмы курэння і вадкасці для іх пры продажы і выкарыстанні будуць распаўсюджвацца тыя ж правілы, што і на цыгарэты. Дэкрэт № 2 уступіць у сілу 27 ліпеня 2019 года.

Месцы, дзе курыць нельга, падзеленыя на два тыпы: дзе курэнне цалкам забаронена і дзе абмежавана. Да першага адносяцца ліфты і дапаможныя памяшканні дамоў, дзіцячыя пляцоўкі, тэрыторыі і памяшканні спартыўна-аздараўленчых лагераў, установы адукацыі, рабочыя месцы ў памяшканнях, падземныя пераходы і станцыі метро, прыпынкі грамадскага транспарту, аўтамабілі, у якіх знаходзяцца дзеці да 14 гадоў. У месцах другой катэгорыі — дзе курэнне абмежавана — да моманту ўступлення дэкрэта ў сілу павінны абсталяваць спецыяльныя пляцоўкі для курэння. Да такіх месцаў адносяцца гандлёвыя цэнтры і рынкі, аб'екты грамадскага харчавання, установы аховы здароўя, спорту і культуры, вакзалы, вытворчыя будынкі і памяшканні, пляжы.

У прыватнасці, на аб'ектах грамадскага харчавання, скажам у кафэ, дзе ёсць залы для тых, хто курыць, іх можна пакінуць, але такія памяшканні павінны быць абсталяваны сістэмамі выцяжкі.

— Гэта патрэбна, каб тытунёвы дым не паступаў у залы для тых, хто не курыць, — растлумачыла **загадчык аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга БАРТМАН.**

А вось забараніць курэнне на балконах пакуль не ўдалося. Як растлумачыла Вольга Бартман, гэта пытанне доўгі час абмяркоўвалася з юрыдычнай службай.

— Паколькі балкон з'яўляецца часткай кватэры, а гэта ўласнасць жыльца, то тут складана прад'явіць патрабаванне, што курыць забаронена.

За парушэнне новых нормаў прадугледжаны штрафы. Як паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Сяргей КРАСУЦКІ,** максімальны штраф — чатыры базавыя велічыні, або 102 рублі.

Дакумент прадугледжвае і іншыя меры па абмежаванні курэння. **Начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Віялета БРАЗОЎСКАЯ** расказала, што з 1 студзеня 2020 года да магазінаў, гандлёвая плошча якіх большая за 1000 кв. м, уводзяцца патрабаванні прадаваць тытунёвыя вырабы, электронныя сістэмы курэння і вадкасці для іх толькі праз адасобленыя таварныя аддзелы.

А з 1 студзеня 2022 года будзе ўведзена забарона на захоўванне і продаж тытунёвых вырабаў у магазінах і павільёнах з абсталявання, размешчанага над касамі.

Алена КРАВЕЦ.

МАРАЗЫ ЧАКАЮЦЬ МАРАЗОЎ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаспадар сям'і Уладзімір Фурс — сапраўдны аптыміст, ён сцвярджае, што жыць у Маразах — самае тое! Карэнны гараджанін, былы інжынер-будаўнік калісьці пасяліўся ў вёсцы і лічыць Маразы сваёй другой радзімай. Са спадарожніцай па жыцці — жонкай Галінай — набылі драўляны дом, рэканструявалі на сучасны лад і, у адрозненне ад сваіх аднавяскоўцаў, ніколі адсюль не з'язджалі.

У канцы сёлетняга студзеня ў Фурсаў была ўрачыстая падзея, нават дзве. Па-першае, паўвека яны жывуць у шлюбе, а па-другое — трыццаць гадоў, як сталі вяскоўцамі. Па прычыне «залатога вяселля» ў Маразы прыехалі дзеці і ўнучкі Фурсаў. Ад цёплай сямейнай сустрэчы, здавалася, і мароз за вокнамі (было мінус пятнаццаць) паступова стаў спадаць. І вось табе — адліга!

— Нашы дзеці і ўнукі (а іх у Фурсаў ажно пяць. — **Аўт.**) любяць прыязджаць у вёску — тут раздолле: лес, грыбы, сад-агарод, лазня, лыжы, веласіпеды, нават інтэрнэт, — кажа Уладзімір Леанідавіч. — Ад вясны да восені сюды вяртаюцца колішнія жыхары — цяпер дачнікі, і нашы Маразы забываюцца пра сваю зімовую адзіноту.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Вілейскі раён.

Залатыя юбіляры: Уладзімір і Галіна ФУРСЫ ідуць разам па жыцці пяцьдзясят гадоў.

Вёска Маразы з вышыні птушынага палёту. На першым плане — дом Фурсаў.

Таццяна СЁМАЧКІНА і яе дачка Вераніка вырашылі пакатаць на санках свайго бацьку і дзеда.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-67967 – здание механических мастерских, площадь – 262,8 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64 (на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005429). Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание механических мастерских с забором. **Склад металлический с бухг. инв. № 70024**, площадь – 225,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91627 – склад,** площадь – 163,9 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64/2 (на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005429). **Станок токарный 1к-62**, инв. № 882. **Станок токарно-винторезный 1к-62 Б**, инв. № 1038. **Станок токарный 163**, инв. № 1095482; **Станок поперечно-строгальный 7Д36** с гидравлическим приводом, инв. № 1095483. **Станция обезжелезования**, инв. № 071006. **Трансформатор, тип ТМ – 400**, инв. № 453. **Трансформатор, тип ТМ – 400**, инв. № 852. **Станок обдирочно-шлифовальный, модель 3м636**, инв. № 1099300. **Станок деревообрабатывающий КСМ-1А**, инв. № 1099091. **Станок заточной модель 3В642**, инв. № 1099301; **Гидравлический пресс ПСУ-10**, инв. № 1099302. **Автомат этикеровочный GERNEP**, инв. № 3915. **Парогенератор ПЭЭ-250**, инв. № 071007; **Компрессор с электрическим двигателем, тип NF-611** в количестве 2 шт, инв. № 1099303. **Автомат розлива по уровню Т1-ВР2Щ**, инв. № 3149. **Трансформатор Тип ТМ – 400/10-75у1**, инв. № 071003; **Участок теплотрассы протяженностью 7,0 м** (инвентарный № 700/С-99163), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского (на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003398). **Участок наружной канализации протяженностью 102,9 м.** (инвентарный № 700/С-90642), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Участок наружного водопровода протяженностью 34,8 м.** (инвентарный № 700/С-90643), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Сведения о земельных участках:** земельный участок с кадастровым номером 740100000005005429, площадь – 0,2210 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания механических мастерских и зданий складов, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Земельный участок с кадастровым номером 740100000005003398, площадь – 0,4349 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий транспортного цеха, весовой и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского, 64.

Начальная цена продажи: 274 936,02 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 27 493,60 бел. руб.

Лот № 2: капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная, площадь – 687,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: трехэтажное кирпичное здание котельной с навесом и дымовой трубой. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68775 – тарный склад**, площадь – 459,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание тарного склада с подвалом, въездом в подвал, металлическим контейнером. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, площадь – 41,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. **Капитальное строение с инв. № 700/С-104263 – артскважина** в сборе, в количестве 2 шт., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, территория ОАО «Могилевоблпищепром» по ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: Сооружение артскважины в сборе, в количестве 2 шт. состоящее из двух артскважин. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, площадь – 44,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада с крыльцом. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91635 – склад**, площадь – 256,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада с двумя заборами. **Емкость металлическая, 80 куб. м,** инв. № 1099304; **линия розлива в кеги, ЛИНОМАТ**, инв. № 3926; **участок теплотрассы протяженностью 86,4 м** (инвентарный № 700/С-99163), расположенный на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003398 по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Участок наружного водопровода протяженностью 37,2 м** (инвентарный № 700/С-90643), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Кабель ААБ 3х120 мм² + 1х70 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 40,4 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **кабель ААБ 3х120 мм² + 1х70 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 34,6 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **Кабель ААБ 3х95 мм² + 1х50 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 40,4 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **Кабель ААБ 3х95 мм² + 1х50 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 34,6 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-104715** – забор-ограждение № 2, протяженностью 154,7 м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского, территория ОАО «Могилевоблпищепром» по ул. Островского, 64В. **Сведения о земельных участках:** земельный участок с кадастровым номером 740100000005005430, площадь – 0,4562 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственных и складских зданий и сооружений, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. земельный участок с кадастровым номером 740100000005003398, площадь – 0,4349 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий транспортного цеха, весовой и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского, 64.

Начальная цена продажи: 445 064,04 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 44 506,40 бел. руб

Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 12 марта 2019 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 11 марта 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для внесения задатка: Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Могилевоблпищепром», УНП 700391109, 212029, г. Могилев, ул. Островского, 64

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

Порядок проведения аукциона: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 29 624-26-25; +375 29 550-09-56

Проектная декларация Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска» (в дополнение ранее опубликованным декларациям в газете «Звязда» от 29.09.2018 г. № 188, от 17.11.2018 г. № 222)

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 27.02.2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, тел./факс 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда – с 8.45 до 13.00; вторник, четверг – с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 3. (2-я очередь строительства). Жилой дом № 21 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

24 однокомнатных квартир 13, 12, 11, 26, 24, 28, 31, 32, 33, 36, 37, 38, 91, 92, 93, 106, 107, 108, 111, 112, 113, 116, 117, 118 (площадью 35,50 – 50,65 кв. м);

16 двухкомнатных квартир: 10, 14, 25, 29, 30, 34, 35, 39, 90, 94, 105, 109, 110, 114, 115, 119 (площадью 56,43 – 56,79 кв. м).

Цена 1 кв. м общей площади квартиры в жилом доме № 21 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет:

– однокомнатной квартиры (площадью 35,5 – 43,73 кв. м) – 2 470,00 бел. руб.;

– однокомнатной квартиры (площадью 50,65 кв. м) – 2 375,00 бел. руб.;

– двухкомнатной квартиры – 2 430,00 бел. руб.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – октябрь 2019 года.

Для заключения договора необходимо:

– личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

– быть готовым оплатить в течение 5 банковских дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению республиканского производственного унитарного предприятия «Завод точной электромеханики» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже:

лот № 1: автомобиль ЗИЛ-131, бортовой, шасси № 568362, год выпуска – 1978, цвет – зеленый.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 727,32 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **372,00 бел. руб.**

Лот № 2: автомобиль ЗИЛ-131 «Мастерская МРМ-М1», кузов фургон, шасси № 584213, год выпуска – 1984, цвет – зеленый.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 4 330,31 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **433,00 бел. руб.**

Лот № 3: автомобиль ЗИЛ-131 «Мастерская МРСАР и МТО-В», без оборудования, кузов – фургон, шасси № 583402, год выпуска – 1984, цвет зеленый.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 4 330,31 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **433,00 бел. руб.**

Лот № 4: прицеп одноосный АДБ-3120У1, агрегат сварочный, шасси № 35129, год выпуска – 1984, цвет – зеленый.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 500,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **150,00 бел. руб.**

Лот № 5: прицеп одноосный ТАПЗ-755, бортовой, шасси № 212380, год выпуска 1990, цвет – зеленый.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 522,60 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **52,00 бел. руб.**

Стоимость лотов снижена на 50 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.01.2019. Аукцион состоится **19.02.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества торгового коммунального унитарного предприятия «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

Таблица № 1

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %
1	Тележка гидравл. 2500 кг 1150*550 мм	105,12	3	Шкаф-купе 1774-450-2156	17,59
2	Тележка гидравл. АС 25 1073	17,54	4	Кап. строение № 500/С-36629, площадь 1414 кв. м	223 200,00

В отношении лотов № 1 – № 3 проводятся седьмые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 15.01.2019 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 70 %. Окончание приема заявлений в 16.00 12.02.2019.
В отношении Лота № 4 проводятся седьмые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 15.01.2019 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 40 %. Окончание приема заявлений – в 16.00 12.02.2019. Лот № 4 расположен по адресу: г. Минск, ул. Селицкого, д. 39, на земельном участке с кадастровым номером 500000000000800170 площадью 0,2813 га, который предоставлен на праве временного пользования

Таблица № 2

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %
1	Строительные товары в ассортименте (перечень https://sites.google.com/site/pcjuristcom/stroitelnye-tovary)	6 010,44	3	Утеплитель top 35 мм (2,5х0,58; толщ. 35, 511 шт.)	3 075,20
2	Утеплитель top 20 мм (2,5х0,75; толщ. 20, 159 шт.)	706,91			

В отношении имущества, указанного в таблице № 2, проводятся пятые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 15.01.2019 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 50 %. Окончание приема заявлений в 16.00 12.02.2019

Дата и время проведения торгов (таблица № 1)	**13 февраля 2019 года в 14.00 (регистрация с 13.40 до 13.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1121
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Задаток	1 % от начальной стоимости предмета торгов

Информация о продавце	Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», г. Минск, ул. Селицкого, д. 39 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10)
Условия для участия в торгах	Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту № __ (Таблица №_), проводимых __.__.2019. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи (при покупке объекта недвижимого имущества – 1 месяц с даты регистрации договора купли-продажи). 5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Андрей, тел. +375 29 304 25 60. 7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: • 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru

Свислочский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион 6 марта 2019 года по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	**ПОВТОРНО!!!!** г. п. Свислочь, ул. Широкая, уч.12, 24455900001001026 (имеется древесно-кустарниковая растительность)	0,1000	Электроснабжение, водоснабжение, возможность подключения к газопроводу	1299,76 + публикация в СМИ	9360,00	936,00

Порядок проведения аукциона оговорен в Положение о его проведении.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона. Представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает со Свислочским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется до 26 февраля 2019 года включительно на расчетный счет BY85AKBB36006251700010000000, код платежа – 04901, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск код AKBBBY2X.

Получатель платежа ГУ МФ РБ по Минской области УНП 600537220 (Свислочский сельисполком УНП 600177892).

Аукцион состоится 6 марта 2019 года в 14.30 по адресу: г. п. Свислочь, ул. Набережная, 11 (здание сельисполкома).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 26.02.2019 года до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения, подлежат возмещению победителем аукциона. Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона; в течении двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Марьиногорское бюро республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения утвержденной проектной документации на строительство жилого дома.

Участникам аукциона предоставляется возможность осмотра земельного участка, на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Контактные телефоны: 801713-24842, 801713-24277

НАЙВЯЛІКШЫ НАБЫТАК — КНІГА

Кніжная выстаўка стартуе ў сераду і ўпершыню пройдзе на розных пляцоўках

6 лютага стартуе адна з самых маштабных літаратурных падзей года — XXVI Мінская кніжная выстаўка-кірмаш — і будзе доўжыцца да 10 лютага ўключна. На выстаўцы ёсць што паглядзець, пачытаць і каго ўбачыць. Цікавосткай гэтага года з'яўляецца тое, што праходзіць кніжны кірмаш не толькі ў выставачным павільёне «Белэкспа» па адрасе Пераможцаў, 14. Сёлета мерапрыемства разгорнецца і на многіх іншых пляцоўках.

Мастацтва графікі

Свой арыгінальны падыход да жыцця кніжнага прапануе **галерэя Саюза дызайнераў Беларусі** (вул. Казлова, 3). Ужо напярэдадні ММКВК, 5 лютага ў 17 гадзін, адкрыецца выстаўка кніжнай графікі беларускіх мастакоў. Найлепшыя ўзоры кніжнай графікі можна будзе пабачыць цягам усіх дзён кніжнага кірмашу ў Палацы мастацтва.

У экспазіцыі, што пройдзе ў дзвюх залах Рэспубліканскай мастацкай галерэі і будзе ўключаць у сябе каля 90 работ, беларускія аўтары розных пакаленняў прадэманструюць найлепшыя прыклады сваёй творчасці, звязаныя з мастацтвам кнігі. Побач з працамі такіх прызнаных мэтраў кніжнай графікі, як Валерый Славук, Віктар Мікіта, Уладзімір Савіч, гледачам будзе прадстаўлена і творчасць мастакоў з пакалення 2000-х гадоў: Паўла Татарнікава, Юрыя Якавенкі, Генадзя Мацура, Ігара Гардзіёнка, Уладзіміра Даўгялы, Маргарыты Цімохавай, Тамары Шэлест. Таксама прадставяць свае работы студэнты кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

На прыкладах, якія ўключаюць у сябе не толькі традыцыйную ілюстрацыю, але і мастацтва шрыфту ці кніжнага знака — экслібрыса — гледачы ўбачаць, як мастакі кнігі, не губляючы сувязі з адметнымі формамі, характэрнымі для беларускай школы, з лёгкасцю працягваюць засвойваць і прагрэсіўныя набыткі сусветнай школы мастацтва кнігі. Трымаючы ў руках сапраўдную папяровую кнігу (новы томік любімых вершаў ці зборнік цудоўна аздобленых мастаком дзіцячых казак), госці выстаўкі змогуць паглыбіцца ў яе сусвет, адчуць і зразумець яе гісторыю, ацаніць велічэзную працу не толькі аўтара, але і мастакоў і ўсіх тых, хто падарыў кнізе жыццё.

І легенды, і паданні

Як расказаў **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК,** іх кніжныя навінкі будуць прадстаўлены і на розных пляцоўках Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі. Асаблівую папулярнасць, на яго думку, будзе мець серыя «Дзіцячы атлас Беларусі». 6 лютага ў 14 гадзін у краме **«КнігаПоліс»** (вул. Сурганава, 46) адбудзецца творчая сустрэча з удзелам аднаго са складальнікаў выдання Дзмітрыем Пятровічам. На выстаўцы прэзентуюць таксама выданне «Легенды і паданні Беларусі». Як аказалася, дзецям надзвычай цікавыя такія на першы погляд сур'ёзныя тэмы, як музыка, культура, традыцыі, таму сёлета запланаваны выхад яшчэ 5-6 такіх выданняў пра мастакоў, іншых культурных дзеячаў нашай краіны.

8 лютага ў 16 гадзін у «КнігаПолісе» можна будзе сустрэцца з Васілём Дранько-Майсюком і яго новым выданнем «Таямніца нашага садка». А бліжэй да канца выстаўкі, 9 лютага ў 13 гадзін, варта зазірнуць **у кнігарню «Вянок»** (Траецкая набярэжная, 4) на аўтографсесію Пятра Васючэнкі, каб набыць яго новую кнігу «Жаласлівая каралеўна». Абодва выданні пабачылі свет у «Мастацкай літаратуры».

Славянскія казкі і гісторыя князёў

Спецыяльна з Францыі ў Беларусь гэтымі днямі завітае апавядальніца, пісьменніца, педагог і тэрапеўт Ганна Лазоўскі. Свае сустрэчы з чытачамі яна распачне яшчэ 4 лютага **ў Гродне,** дзе ў 14 гадзін **у абласной бібліятэцы** (вул. Замкавая, 20) сустрэнецца з франкафонамі і іншымі зацікаўленымі. 5 лютага Ганна Лазоўскі адкажа на пытанні франкамоўных мінчан — у 15.30 **у Французскай медыятэцы** (вул. Гікалы, 4).

Пісьменніца з'яўляецца аўтарам дзвюх анталогій аб культурнай спадчыне і выдуманых светах: «Казкі славянскіх мудрацоў» і «Казкі скандынаўскіх мудрацоў», якія выйшлі ў Францыі. У кастрычніку 2018 года ў яе выйшла кніга «Вакол Балтыкі», якая аб'ядноўвае тры казкі — славянскую, скандынаўскую і дацкую. А ў сакавіку 2019 года выйдзе яе кніга «Казкі мудрацоў — захавальнікаў мораў», у якой аўтар звяртаецца з паэтычным заклікам ахоўваць і засцерагаць акіяны.

У Прэзідэнцкай бібліятэцы Беларусі гэтымі днямі пагавораць пра гісторыю Мірскага замка. Тут адбудзецца прэзентацыя міжнароднага культурнага праекта, які ў 2019—2020 гадах будзе рэалізоўвацца «Замкавым комплексам «Мір» сумесна з Дырэкцыяй рэгіянальных паркаў Павільна і Верка ў Літве. Акрамя таго, 7 лютага ў Прэзідэнцкай бібліятэцы будзе прадстаўлена калектыўная манаграфія «Князі Вітгенштэйны і іх уладанні ў Расійскай Імперыі ў XIX стагоддзі» (і Мір, і Веркаўскі палацы ў XIX стагоддзі належалі князям Вітгенштэйнам).

Згаданая манаграфія прысвечана гісторыі роду князёў Вітгенштэйнаў, якія ў XIX стагоддзі мелі вялізныя ўладанні на тэрыторыі сучасных Літвы, Беларусі, Расіі і Малдовы. У кнізе адлюстраваны падзеі, якія дагэтуль мала асвятляліся ў беларускай гістарыяграфіі, а аснову яе склалі даклады міжнароднай навуковай канферэнцыі «Князі Вітгенштэйны і іх уладанні ў XIX стагоддзі», якая адбылася ў музеі «Замкавы комплекс «Мір» у 2015 годзе.

Акварэль і... мёд

Натуральна, шмат самых разнастайных мерапрыемстваў пройдзе ў самім **выставачным цэнтры «Бел-Экспа».** Адным з экспанентаў будзе Выдавецкі дом «Звязда».

7 лютага ў 15 гадзін на стэндзе выдавецтва разгорнецца надзвычай цікавае дзейства — прэзентацыя рубрыкі «Клуб пчаляроў» часопіса «Родная прырода». Сюды завітаюць найлепшыя пчаляры нашай краіны, якія падзеляцца сакрэтамі пчалярскай справы. Тут жа адбудзецца і дэгустацыя мёду!

А 8 лютага ў 18 гадзін **на стэндзе «Звязды»** адбудзецца аўтограф-сесія Людмілы Рублеўскай. Чытачы змогуць пазнаёміцца не толькі з самой пісьменніцай, але і з яе новай, пятай, кнігай серыі «Авантуры Пранціша Вырвіча» — «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага Доктара». Гэтыя «раманы прыгодніцкія і фантасмагарычныя» — так акрэслівае жанр твораў сама пісьменніца — знаёмяць чытачоў з захапляльнымі прыгодамі шляхціца Пранціша Вырвіча і яго вернага спадарожніка доктара Баўтрамея Лёдніка. Падзеі ў творах адбываюцца ў XVIII стагоддзі — у эпоху авантурыстаў і алхімікаў, рыцараў і чароўных дам, палацавых інтрыг і крывавых войнаў...

9 лютага ў 15.30 «Звязда» прэзентуе альбом «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца». Можна будзе ўбачыць і выстаўку акварэляў мастака. Плануецца музычнае выступленне струннага квартэта выкладчыкаў музычнай школы № 15.

Пасля праграмы на галоўнай сцэне на стэндзе выдавецкага дома Вячаслаў Паўлавец правядзе майстар-клас па акварэлі. Тут жа адбудзецца бяспройгрышная латарэя твораў мастака.

* * *

Натуральна, што гэта толькі некаторыя мерапрыемствы насычанай праграмы XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Завітвайце самі — усё астатняе пабачыце на свае вочы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Унікальны праект

Падарожжа ад мезаліту да Сярэднявечча

Без адзінага цвіка ўзводзяцца пабудовы гарадзішча — археалагічнага музея пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы

Як вядома, навіны распаўсюджваюцца хутка, і найхутчэйшыя з іх — фэйкавыя. У карпункт патэлефанаваў чытач, які на адным з сайтаў прачытаў, што ў наступныя выхадныя будзе адкрыты для наведвання турыстаў археалагічны музей-скансэн у пушчы. Я звязалася з **навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага парка Русланам КНІГАЙ.** Ён паведаміў, што аўтары навіны паспяшаліся. І не яны першыя. Яшчэ раней у сеціве з'явілася інфармацыя, што музей адкрываецца ў снежні: «Тое, што пра аб'ект гавораць, несумненна, добра, значыць, ён загадзя набывае папулярнасць. Але аматарам даўніны трэба пачакаць да вясны».

Менавіта з цяплом, першымі краскамі і птушкамі ў Белавежскай пушчы адбудзецца ўрачыстае адкрыццё першага ў краіне археалагічнага музея пад адкрытым небам. Ідэя яго ўзвядзення была агучаная падчас святкавання 600-годдзя ўстанаўлення запаведнасці пушчы ў 2009 годзе. А за некалькі гадоў да гэтай падзеі ў нацпарк прыехала група археолагаў з Інстытута гісторыі НАН. У выніку раскопак знайшлі больш за паўсотні стаянак старажытнага чалавека, ну і вялікае мноства прадметаў побыту розных эпох. Фрагменты зброі, посуду,

прыстасаванняў для будаўніцтва лічылі дзясяткамі і нават сотнямі. Значыць, цяперашняя тэрыторыя пушчы — улюбёны чалавекам край спакон вякоў.

Паводле навуковых даследаванняў, прыкладна 11 тысяч гадоў таму адсюль сышоў апошні ледавік. Старажытныя людзі займалі новыя тэрыторыі, узводзілі сваё жытло, умацоўвалі яго. Так было і ў раёне цяперашняй «сталіцы» пушчы — вёскі Каменюкі. Толькі ўздоўж адной рэчкі Правай Лясной археолагі адкапалі рэшткі 23 стаянак. Тут і вырашылі зрабіць унікальны музей, дзе будуць прадстаўлены ўсе перыяды жыцця людзей на гэтай тэрыторыі.

У аснове кампазіцыі музея-скансэна — сем частак, якія будуць адлюстроўваць розныя эпохі: ад мезаліту да Сярэднявечча. Першым узведзена гарадзішча бронзавага-жалезнага вякоў. Гэта значыць, што наведвальнік зможа акунуцца ў культуру і побыт людзей, якія жылі на нашай зямлі дзве з паловай тысячы гадоў таму.

Жыллё і гаспадарчыя пабудовы ўзводзяцца з пушчанскай драўніны. І максімальна адпавядаюць вобразу старажытнасці, бо высякаюцца сякерай, не дапускаецца ніводнага цвіка, ніводнага спілу. Па цэнтры экспазіцыі размесціцца паганскае капішча. Руслан Кніга адзначыў, што старажытныя насельнікі пушчанскага краю вялікае значэнне надавалі склепам і гаспадарчым памяшканням. Таму вырашана ўзнавіць такі склеп. Ён зрублены сякерай, пераплецены галінамі і накрыты чаротам.

А жылая пабудова ўяўляе сабой старажытны дом на дзве сям'і з адкрытым ачагом для вогнішча. Сцены ўпрыгожваюць скуры зубра, аленя, казулі, зайца. Тут жа прымацаваны альбо падвешаны прылады працы і палявання. Продак меў у сваёй гаспадарцы лук, стрэлы, абарончую рагаціну, вядома, кошыкі з камянямі. Ну а яго гаспадыня клапацілася, каб назапасіць гаючых пушчанскіх траў, якія падвешваліся пад столлю і захоўваліся да наступнага лета. Яна ж даглядала і захоўвала керамічны посуд. Да гэтага перыяду, паводле навуковых звестак, адносіцца культура штрыхаванай керамікі. Такія ўзоры посуду будуць прадстаўлены ў музеі, праўда, у выглядзе копій артэфактаў з гарадзішча, знойдзенага ў Вілейскім раёне. І яшчэ многа розных цікавінак абяцаюць нам стваральнікі музея пасля яго адкрыцця.

З першага погляду гэта гарадзішча нагадвае драўляную крэпасць. Яе ахоўваюць традыцыйны роў, акружны абарончы вал. Праз мосцік можна трапіць у высокія ўязныя вароты. Самі ж пабудовы хаваюцца за двухзрубнай сцяной, над якой узвышаецца назіральная вежа. Вежа і ёсць самая высокая пабудова музея. Раней такія ўзводзілі для абароны і назірання за мясцовасцю, каб не прапусціць падыход ворага.

Для турыста-наведвальніка будуць прапанаваныя не толькі візуальныя экскурсіі, але і непасрэдны кантакт з побытам той эпохі, як гэта цяпер модна. Маецца на ўвазе магчымасць, напрыклад, зляпіць рукамі без ганчарнага кола гліняны гарлачык (кола тады яшчэ не было распаўсюджана) ці далучыцца да старадаўняга вертыкальнага ткацтва.

Работы па стварэнні не зусім звычайнага для нашай краіны музея выканалі спецыялісты прадпрыемства «Брэстрэстаўрацыя». Прылады працы, якія можна было выкарыстоўваць, — лапаты, сякеры, цесакі. Драўніну і чарот насычалі спецыяльным растворам, каб пабудовы даўжэй праслужылі. А для таго каб зацягнуць наверх бярвенні, рабілі рыштаванні. Адно бервяно з дапамогай вяровак уздымалі восем-дзесяць чалавек. Як і раней.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«З НАШАЙ ПРАФЕСІЯЙ МЫ ЎСЁ РОЎНА БАГАЦЕЙШЫЯ»

— Вашы дзядуля, бацька, муж і дачка звязаны з Купалаўскім тэатрам, і самі вы працуеце тут з 1982 года. Можна сказаць, аддалі яму ўжо больш за жыццё. Ці шкадавалі вы калі-небудзь, што засталіся на адным месцы і не паспрабавалі нешта іншае?

— Не, ніколі. У свой час Купалаўскі тэатр быў для мяне ідэяй фікс, марай, недасяжнай Жарптушкай, як у казцы. Ён і сапраўды быў недасяжны, сюды бралі выключных людзей, найлепшых, «адборных». Сёння за кошт гэтага ў нас цікавая і рознабаковая трупа. Калі на чацвёртым курсе мяне паклікалі ў Купалаўскі іграць Паўлінку, я нават не ведаю, як гэта вытрымала. Адказнасць была настолькі высокай, што, калі я падыходзіла да тэатра, дзе павінна была быць рэпетыцыя, мяне ўсю калаціла. Недзе праз год я крыху выдыхнула і адчула, што мяне тут паважаюць, што ў мяне ёсць сябры, а лепшага і быць не можа. Я ведаю іншыя трупы і магу сказаць, што ў нас вельмі прыстойны тэатр, перш за ўсё таму, што тут няма субардынацыі «я мэтр, а ты ніхто». Старэйшых у нас паважаюць, як бацьку, маці, дзядулю, мы ў сваю чаргу клапоцімся пра моладзь, можам і пажурыць, і пажартаваць. У Купалаўскім усё вельмі проста, без крыўляння, вычварнасці, надуманасці. Мяркую, з глядзельнай залы бачна, што на сцэне — проста добрыя выхаваныя людзі. Колькі б ні было ў мяне розных прапаноў, і за мяжу звалі, я не магла адсюль сысці, напэўна, з-за каранёў. Некаму гэта можа падацца дрэнным, але ж калі карані добрыя, то і дрэва нармальна трымаецца. Я лічу, у мяне цудоўныя карані і сям'я — скарбніца талентаў і творчасці. Мая бабуля таксама была актрысай, маці — піяністкай. Я толькі не ўпэўнена, што хачу, каб мае ўнукі ў нашай краіне сталі артыстамі...

Магчыма, у якой-небудзь іншай артыстаў больш паважаюць... Але ж з нашай прафесіяй мы ўсё роўна багацейшыя. Ніхто не можа купіць тое, што нам даецца бясплатна, — тое шчасце, калі ты знаходзішся на сцэне і адчуваеш яднанне з залай. У Купалаўскім да таго ж асаблівая атмасфера. Мой муж (рэжысёр і мастацкі кіраўнік РТБД Аляксандр Гарцуеў. — **Аўт.**) на днях прыйшоў на здачу спектакля і сказаў, што ў Купалаўскім адчувае сябе як дома. І правільна, бо, адпрацаваўшы тут трыццаць два гады, ты наўрад ці знойдзеш іншы дом. Тут мы адзін аднаго падтрымліваем, бо ў нас агульная справа, а адзін ты — ніхто. Хутка нам будзе сто гадоў. Да гэтага моманту хочацца, каб краіна зразумела, наколькі Купалаўскі важны аб'ект для нашай культуры. Я б нават у яго гонар год абвясціла.

— Вы з'яўляецеся сведкам таго, як развіваўся і мяняўся Купалаўскі. Што тэатр 1980—1990-х у параўнанні з сённяшнім?

— Быў перыяд, калі на сцэне было бог ведае што. Побач з грунтоўнымі, цудоўнымі, эпічнымі пастаноўкамі Валерыя Раеўскага ішлі слабыя і безгустоўныя камедыі. Валерый Мікалаевіч, як мог, трымаў планку тэатра, а потым прыйшоў Мікалай Пінігін, і мы паступова вырулілі на тое, што называецца «і нашым, і вашым». І капейчыну зарабіць, і каб нешта высокамастацкае з'явілася. Адкуль у нас кабарэ і буржуазныя камедыі? — бо мы павінны самі сябе карміць, але і яны культурныя знешне, па сцэнаграфіі, па рэжысуры, па акцёрскім выкананні. Бо могуць быць і некультурнымі.

— А як 90-я прайшлі для тэатра і вас асабіста?

— Мы працавалі і працавалі, а для ўсіх было адно і тое ж — галота і бедната. Былі пустыя залы на цудоўных, тонкіх, інтэлігентных спектаклях. У выніку іх здымалі, бо глядач не хадзіў. Памятаю, як Андрэй Андросік паставіў вельмі прыгожую «Блакітную ружу» па п'есе «Шкляны звярынец» Тэнесі Уільямса. Заслона адкрывалася, і мы бачылі на трэць запоўнены партэр. А для акцёра, калі там пуста, працаваць немагчыма і балюча. Спектакль так і сышоў, а я яго любіла. А на нейкую бяздарную камедыю валам валіў народ. Сёння над намі няма гэтых нажніц, цяпер, дзякуй богу, усё прыстойна. Залы запаўняюцца, але, канешне, не самі сабой: добра працуе рэкламная служба. Неяк хадзіла глядзець свайго студэнта ў адным з тэатраў і была там адной з трыццаці ці сарака гледачоў — гэта жах.

— Ведаю, што пэўны час у Купалаўскага была практыка ездзіць на гастролі па вёсках і мястэчках краіны. Як гэта адбывалася?

— Цудоўна. Напрыклад, з «Паўлінкай» ехалі ў Салігорск — там у нас была база. Мы спыняліся ў гасцініцы і з гэтай базы кожны вечар выязджалі ў якую-небудзь вёску. Дамы культуры былі розныя, па памерах бывалі быццам грымёркі з маленькімі сцэнкамі. Памятаю, у адным з такіх будынкаў у нас была вечарына, дык масоўка ўсоўвалася ў вокны, бо не было куды нават сесці, не тое што танцы танцаваць. Глядач сядзеў на табурэціках, і вось так магло быць 25 спектакляў запар. У верасні бывала, яшчэ да пачатку сезона, ехалі ў якія-небудзь Ушачы, а ўжо было холадна, таму на сцэне дыхалі парай. Гэта была цудоўная культура. Мы прыязджаем а шостай ці сёмай вечара, а нам кажуць: «Ой, не, мы не можам, кароў яшчэ не падаілі». І мы чакаем сканчэння вячэрняй дойкі, ідзём да бабулек па дамашнія яйкі і малако, хто салка якое, хто цыбулю бярэ, а тыя кажуць: «Ой, не трэба мне вашых грошай». Калі жанчыны падояць кароў, мы іграем спектакль і позна-позна вяртаемся на базу. Чаму мы гэта робім, не абмяркоўвалася. Публіка прыходзіла з вяргінямі, дзеці бегалі, бабулькі радаваліся — гэта ж цуд. У пэўны момант гэта стала непатрэбна.

— Тэатр жа шмат вандруе. Якая ў вас была самая экзатычная краіна для гастроляў?

— Напэўна, самай экзатычнай быў Кітай, летась мы з «Чайкай» праехалі з яго поўдня на поўнач. Мы і сёння настальгуем аб той паездцы. Гэта было цікава, зусім іншая планета, мы так і не зразумелі, што гэта за яна. Звычайна мы працавалі ў агромістых оперных тэатрах: у Гуанчжоў, напрыклад, два разы ігралі ў зале на 1800 месцаў, і яны ўсе былі занятыя. Я не ведала, як мы вернемся ў наш маленечкі Купалаўскі і будзем тут іграць. Я ўвогуле артыст стадыёна. Калі я першы раз на стадыёне чытала Купалу, падумала: «Божа-Божа, чаму я не нарадзілася дзе-небудзь у Грэцыі, каб іграць у амфітэатры». Калі яны апладзіравалі і нешта крычалі на кітайскай, гэта вельмі ўзрушвала, тыя гастролі запомніліся на ўсё жыццё. Больш скажу, часам яны рэагавалі і ўспрымалі «Чайку» лепш за беларускіх гледачоў.

— Са сваім мужам вы зараз працуеце ў розных тэатрах. Вы неяк дапамагаеце адно аднаму ў рабоце?

— Безумоўна, толькі не агрэсіўна, спецыяльна ніхто не ўмешваецца ў працэс. Мы заўсёды побач, я звяртаюся да яго з пытаннямі, мы абмяркоўваем, што здарылася за дзень. Калі мы праводзім адпачынак на хутары, праца ідзе агульная: у яго шмат літаратурных спраў, бо ён з нічога ці з *нечага* стварае п'есы, я таксама нешта чытаю, рыхтуюся да студэнтаў. І, безумоўна, мы ўплываем адзін на аднаго. На сённяшні дзень мы ўжо адно цэлае, хоць ён зусім адрозны. Як і дачка — «асобная асоба».

— А ў дачкі вы нечаму вучыцеся?

— Так, і ўвогуле ў моладзі, я ж не з-за грошай працую ў Акадэміі мастацтваў. У студэнтаў я пераймаю смеласць, якой мне часам не хапае, яны дапамагаюць мне не зашорваць вочы і быць на хвалі, не згубіць смак сучаснасці і не стаць акадэмічнай спарахнелай цёткай. Студэнты прыходзяць і заўсёды нейкія іншыя, яны маладыя, цікаўныя, адкрытыя, праўда, бывае занадта. Часам ім здаецца, што яны адкрываюць «амерыкі», а я ім расказваю, што гэтыя «амерыкі» ўжо былі адкрыты, напрыклад, Усеваладам Меерхольдам, Аляксандрам Таіравым ці ўвогуле ў часы Старажытнай Грэцыі.

— А як вы ўспрымаеце змены, якія сёння адбываюцца з тэатрам, рэжысёрскія канцэптуальныя, пластычныя пошукі?

— Я лічу, напрыклад, «Чайку» Мікалая Пінігіна канцэптуальнай гісторыяй. Я за тое, каб усё, што можа быць, — усё было, калі яно не ўтрымлівае абразу ці агрэсіўна спрачаецца з сутнасцю тэатра.

— Тады трэба растлумачыць, што такое сутнасць тэатра.

— Я думаю, што сутнасць тэатра не ў падключэнні галавы — гэта толькі пачуцці і перажыванні. Калі я сяджу ў зале, павінен здарыцца катарсіс — ці ад светлай, яскравай камедыі (а камедыя наогул складанейшы за іншыя жанр), ці ад драматычнага разбурэння чалавечай істоты. Ты пачынаеш іграць ролю адным, а канчаеш зусім іншым — тое ж павінна здарыцца і ў глядзельнай зале. А галава падключаецца ўжо пазней. У тэатры не трэба паказваць карцінку і нешта разжоўваць — я хачу ўбачыць намёк, які, як разумны чалавек, канешне, зразумею. Некаторыя сучасныя пастаноўкі, пра якія кажуць як пра адкрыццё Амерыкі, насамрэч трацічныя ці нават чацвярцічныя і пяцярычныя. Мы аб'ездзілі ўвесь свет з «Крывавай Мэры» — вось гэта быў унікальны спектакль, у пэўным сэнсе тое самае адкрыццё Амерыкі.

— Важным для акцёра з'яўляецца момант, калі яго некуды «выбіраюць», то-бок запрашаюць на ролю. Ці захавалася ў вас трапятанне перад гэтым момантам?

— Колькі б артысту ні было гадоў і як бы ён сябе ні адчуваў у прафесіі, ён балюча ўспрымае, калі не бачыць сябе ў раскладзе. Такая дзіўная ў нас прафесія — нельга зайсці на гару і на ёй застацца. Каб быць на вяршыні, нават каб проста не адкаціцца назад, трэба ўвесь час бегчы з усяе сілы. Я стараюся падрыхтаваць студэнтаў, каб яны ўсё правільна ўспрымалі і ў выпадках, калі іх не выбіраюць на ролю, думалі аб тым, чаму яны не падыходзяць і ці ёсць ім у спектаклі ўвогуле што рабіць.

— Беларускія акцёры, і вы ў прыватнасці, даволі многа ўдзельнічаюць у расійскіх тэлевізійных праектах. Ці не шкада вам высілкаў на такога кшталту працу?

— Не, на жаль, не шкада, бо я за гэта атрымліваю грошы. Пры іншым раскладзе я ніколі б у іх не здымалася, і многія з нас палічылі б за лепшае пачакаць нечага іншага. Для мяне роля без адзінага слова ў Сяргея Талыбава (у беларускім фільме 2018 года «Унутры сябе». — **Аўт.**) пераважвае ўсе мае папярэднія ролі ў кіно. А што нам рабіць, як жыць, дзяцей карміць, апранацца, лячыць зубы, плаціць за кватэру? Удзел у расійскіх серыялах — гэта неабходнасць. Сярод іх ёсць і прыстойныя, я, напрыклад, не шкадую, што знялася ў «Чорнай крыві», прыемна хоць бы, калі рэжысёр ведае, як з табой працаваць на здымачнай пляцоўцы. Ну а дзе ж нашы беларускія фільмы?

— Значыць, жыццё акцёра не такое прыгожае, як падаецца?

— Не, не такое прыгожае. Але я ведала, што мяне чакае. Проста хацелася б, каб ставіліся да нас крыху з большай павагай. Бо калі знікне гэтая дробная інтэлігенцыя, не ведаю, што з намі будзе. «Ураджай» (новая пастаноўка Купалаўскага тэатра па п'есе Паўла Пражко. — **Аўт.**) уласна і паказвае, што нас чакае. Да таго дойдзе, што мы будзем гугліць, як прышыць гузік. Я бачу шмат цудоўных, прыгожых, разумных дзяўчат, якія не могуць знайсці хлопца, які б ім адпавядаў... гэта ж праблема.

— У нас недахоп мужчын?

— Не, недахоп тых самых мужчын.

— І пад канец, Зоя, я ўспамінаю, як павольна вы адчуваеце сябе ў кароткай сукенцы ў «Рэвізоры»... раскажыце ваш сакрэт прыгажосці.

— На сцэне я ва ўсім адчуваю сябе павольна, хоць комплексаў больш, чым у каго. У жыцці, мне здаецца, кароткую сукенку я не насіла ўжо гадоў сто пяцьдзясят. Я лічу так: назваўся груздом, лезь у кош. У артыстаў ёсць як правы, так і абавязкі. Ты абавязаны прыстойна выглядаць і не маеш права не працаваць над сабой. Усё жыццё я гэтым і займаюся. Калі няма здароўя пабегаць ці зрабіць планку, стараюся больш хадзіць. Хоць праца ў нас такая, што не заседзішся, і са студэнтамі я таксама бегаю, больш нават, чым яны. Нарэшце, не рабіць дрэннага іншым і думаць пра найлепшае — гэта таксама дзейнічае.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асоба

ДАСКАЗАЦЬ НЕДАСКАЗАНАЕ

10 невядомых (малавядомых) фактаў пра Уладзіміра Мулявіна

У мінулую суботу, 26 студзеня, споўнілася шаснаццаць гадоў са дня, калі Уладзімір Мулявін пайшоў з жыцця. Да таго ж 2019-ы — год пяцідзесяцігоддзя «Песняроў»: той самы культавы ансамбль, што грымеў на ўвесь Савецкі Саюз і быў вядомы далёка за яго межамі, пачынаў «Лявонамі» ў Мінскай філармоніі, якім 1 верасня 1969 года дазволілі называцца ВІА. Аказалася, у біяграфіі Уладзіміра Мулявіна даволі лакун, але з расказамі яго сваякоў, сяброў і знаёмых прабелы запаўняюцца даволі цікавымі фактамі. Займальных гісторый, апублікаваных у тым ліку ўпершыню, хапае ў кнізе «Уладзімір Мулявін і Лідзія Кармальская. Недасказанае...» аўтарства музыказнаўца Вольгі Брылон і дачкі музыканта Марыны Мулявінай. Кніга акцэнтуе ўвагу на перыядзе, калі Уладзімір Мулявін жыў са сваёй першай жонкай — артысткай Лідзіяй Кармальскай, той самай, «без якой невядома, ці былі б «Песняры». Разам з Вольгай Брылон мы пакапаліся ва ўпершыню апублікаванай перапісцы, упершыню паказаных фотаздымках і ўпершыню абнародаванай інфармацыі і вылучылі дзесяць, часам нават крыху неверагодных, фактаў пра жыццё знакамітага музыканта.

1. Бацьку Мулявіна арыштавалі за сувязь з сынам Чан Кайшы

Уладзімір Мулявін усё жыццё вінаваціў бацьку ў тым, што той кінуў сям'ю. Аказалася, Акуліна Сяргееўна, маці Уладзіміра, сама спалохалася і збегла са Свярдлоўска ў пасёлак Дзягцярка (сёння горад Дзягцярск), калі ў 1939 годзе яе муж Георгій трапіў пад рэпрэсіі. Георгія Мулявіна асудзілі за сувязь з сынам прэзідэнта Кітайскай Рэспублікі Чан Кайшы, з якім яны разам жылі ў студэнцкім інтэрнаце. Калі Чан Кайшы ў савецкай улады аказаўся ў няміласці, ворагам стаў і яго сын, а ў выніку і Георгій Мулявін. Пасля пераезду Акуліна Мулявіна баялася нават наведваць мужа ў турме, так іх шлюб і распаўся. Георгій Мулявін быў рэабілітаваны і, як расказаў яго сын ужо ад другога шлюбу Ілья, да канца жыцця насіў у нагруднай кішэні партрэт Лаўрэнція Берыі, што абвясціў амністыю, па якой ён зноў апынуўся на свабодзе.

2. Бацькам Уладзімір Мулявін называў свайго дзядзьку Філіпа Палычава

У ліставанні з жонкай Лідзіяй Кармальскай Мулявін часта згадвае бацьку, але мае на ўвазе не Георгія Мулявіна, а свайго дзядзьку Філіпа Палычава, у сям'і якога жыў да трынаццаці гадоў. Калі Акуліна Мулявіна засталася адна з дзецьмі, адзін з яе братоў, якіх у яе было пяць, прапанаваў узяць Уладзіміра да сябе на выхаванне. У Філіпа з жонкай не было ўласных дзяцей, а жылі яны па тых часах даволі заможна — галава сям'і ўтрымліваў абутковую майстэрню. У выніку «бацька», можна сказаць, вырасціў Уладзіміра Мулявіна, упершыню падштурхнуў да заняткаў музыкай і палюбіў настолькі, што захацеў усынавіць, але маці Уладзіміра гэтага не дазволіла.

3. З першай жонкай Мулявін пазнаёміўся падчас камандзіроўкі канцэртнай брыгады

У канцы 1950-х, калі Уладзімір Мулявін пачаў працаваць у Томскай філармоніі, для кожнага з эстрадных жанраў — акрабатычнага, танцавальнага ці песеннага, — паколькі фанаграм яшчэ не існавала, патрабаваўся акампанемент. Функцыю такога акампанементу выконваў эстрадны квартэт філармоніі, у якім іграў Мулявін. Як частка квартэту музыкант паехаў у свае першыя гастролі, якія тады маглі цягнуцца некалькі месяцаў, а то і паўгода. Ужо хутка на работу ў філармонію паступіла Лідзія Кармальская, якую адразу адправілі даганяць канцэртную брыгаду. У гэтай камандзіроўцы Мулявін і Кармальская пазнаёміліся і пачалі свае адносіны. Мулявіну тады было 18, а Кармальскай — 21.

4. Мінская філармонія адмовіла Мулявіну ў прыёме на работу

Калі Лідзія Кармальская нарадзіла дачку Марыну, Уладзімір Мулявін з Кемерава, дзе яны тады жылі, паехаў шукаць работу бліжэй да Еўропы, а дакладней у Маскву. Перад адпраўленнем цягніка на томскім вакзале музыкант пайшоў у прыбіральню, дзе хуліганы заўважылі яго дарагі гадзіннік і паспрабавалі адняць. У гэты момант у прыбіральні аказаўся хлопец, які валодаў усходнімі адзінаборствамі, і адбіў Уладзіміра і яго гадзіннік. Ім аказаўся акрабат Аляксандр Ван Лі, які таксама шукаў работу ў філармоніі і ехаў у тым жа напрамку, толькі далей за Маскву — у Мінск, куда запрасіў і Мулявіна. Ван Лі ў мінскую філармонію ўзялі адразу, а Мулявіну адмовілі, бо гітарыстаў, маўляў, і без таго хапае. Ван Лі потым казаў, што гэта ён упершыню прывёз Мулявіна ў Мінск.

5. Пэўны час зоркай у сям'і быў не Мулявін, а Кармальская

Лідзія Кармальская была выканаўцай незвычайнага жанру мастацкага свісту, дзякуючы чаму ў 1963 годзе яе з радасцю прынялі ў Мінскую філармонію. Гітарыстаў жа ў Мінску хапала, таму Уладзімір Мулявін быў прыняты на работу, верагодна, як дадатак да Кармальскай. Тут ён працягнуў выконваць другарадную ролю акампаніятара для сваёй жонкі і іншых артыстаў. Але ўсё змянілася з IV усесаюзным конкурсам эстрады ў Маскве. Філармонія рабіла стаўку на нумар Кармальскай, а «Лявонам», як спачатку называліся «Песняры», давялося яшчэ пазмагацца за магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе асобна. Кіраўніцтва філармоніі доўга не давала згоды, але нарэшце сказала нешта накшталт: «Ну і чорт з імі, хай едуць, аблажаюцца і вернуцца дадому». У выніку выступленне Кармальскай на конкурсе не залічылі з-за ўзросту, а «Лявоны» падзялілі другую прэмію з Львом Лешчанкам (першая прысуджана не была).

6. Мулявіна не хацелі пераводзіць з музычнай роты з-за яго актыўнай дзейнасці

Уладзімір Мулявін служыў тры гады — адзін у музычнай роце, што значыла звычайную салдацкую службу з музыкальнымі заняткамі ў дадатак, і два ў Ансамблі песні і танца Беларускай ваеннай акругі, які даваў служачым пэўную свабоду. Сярод тых, хто служыў разам з Мулявіным, — заслужаны артыст Расіі Мікалай Маісеенка, заслужаны артыст Беларусі Віктар Стральчэня, заслужаны артыст БССР Міхаіл Зданевіч, зорка маскоўскай аперэты Юрый Ведзянееў. У лістах жонцы Мулявін пісаў, як нясоладка служыцца ў музычнай роце, і жартаваў пра тое, як «ледзь не здох на кросе, а морду хутка разгоніць так, што ён стане выглядаць як старшыня калгаса». Ігар Раеўскі, які ў той час быў начальнікам-мастацкім кіраўніком Ансамбля песні і танца, расказаў аўтарам кнігі, што Мулявіна не хацелі пераводзіць на больш прывабную службу ў Ансамбль, бо паказчыкі музычнай роты дзякуючы яго дзейнасці заўважна палепшыліся. Ігар Раеўскі таксама ўспомніў, як ужо ў ансамблі раздаваў музыкантам партыі, а Мулявін сказаў: «Ігар Іванавіч, я прашу вас, не пішыце мне, калі ласка, маю партыю. Я паслухаю і сам складу». «І фокус быў у тым, што ён слухаў твор толькі адзін раз, а потым уставаў і абвалакваў аркестр нейкай неймавернай гармоніяй», — кажа Раеўскі.

7. Мянушка Муля з'явілася ў музыканта ў арміі

Калі ў 27 гадоў Уладзімір прыйшоў служыць у музычную роту, там ужо быў адзін гітарыст — Сулейман Абдулаеў. Яны з Сулейманам пасябравалі і сталі іграць разам, пра што Уладзімір згадваў у лістах жонцы, маўляў, сыгралі дуэтам, магло б быць і лепш. А паколькі ў Сулеймана была мянушка Суля, Мулявіна сталі называць Муляй. І называлі так усё жыццё.

8. Мулявіну не дазвалялася насіць цяжкасці

Шмат хто са знаёмых Уладзіміра і Лідзіі казаў, што, калі б не Кармальская, невядома, ці былі б «Песняры». Жонка бачыла талент Уладзіміра і па-добраму не давала яму спуску: прымушала займацца, клапацілася аб адпачынку, не дазваляла насіць цяжкасці, бо трэба берагчы рукі. Марына Мулявіна ўспамінае: самым цяжкім, што мог несці бацька, быў чахол ад гітары. Лідзія Кармальская працавала ў складзе «Песняроў» да 1974 года і нездарма ў яе архівах ляжыць грамата за «актыўны ўдзел у стварэнні і рабоце ансамбля «Песняры».

9. У дзень смерці брата Валерыя Мулявін адыграў канцэрт

Валерый быў старэйшым братам, але ў творчым плане глядзеў на Уладзіміра знізу ўверх. З-за некаторых правін Валерыя лідар ансамбля мог выйсці з сябе настолькі, што іншыя сябры калектыву нават абаранялі калегу і прасілі даць яму шанц. Тым не менш браты былі вельмі прывязаны адзін да аднаго. Калі «Песняры», ужо вельмі вядомы калектыў у СССР, прыехалі ў крымінальны горад Ялта, Валерый адправіўся на спатканне. На наступны дзень яго знайшлі мёртвым, а на вечар у «Песняроў» быў запланаваны канцэрт. Які нельга было адмяніць.

10. Сыход Мулявіна з сям'і быў прадказаны Ганнай Арго

Мулявін з Кармальскай распісаліся 20 красавіка 1960 года ў Калінінградзе, дзе пазнаёміліся і пасябравалі з Ганнай Арго — Вольфам Месінгам у жаночым абліччы. Тады Ганна сказала Лідзіі, што Уладзімір — мужчына, якога тая будзе кахаць усё жыццё. У пачатку 1960-х яны зноў сустрэліся ў Мінску, калі Ганна Арго сама паклікала Лідзію да сябе, каб прадказаць, што ў яе народзіцца сын, якога праз дваццаць гадоў магчыма страціць, і пасля нараджэння дзіцяці яна альбо развядзецца, альбо стане ўдавой. Марына Мулявіна памятае, як маці прыйшла дадому і ў размове з бабуляй сказала: «Ніхто не збіраецца разводзіцца, а памяраць тым больш». Праз паўтара года Лідзія зацяжарыла і нарадзіла сына, развялася з Мулявіным, праз дваццаць гадоў сын трапіў у аварыю, але выжыў.

Запісала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Кніга «Уладзімір Мулявін і Лідзія Кармальская. Недасказанае...» намінавана на прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

ИЗВЕЩЕНИЕ

6 марта 2019 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления	Начальная цена предмета аукциона*, бел. руб.	Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и **дополнительно** расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства) Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения. **Проведение аукциона с условиями** Земельные участки с самовольными капитальными (некапитальными) строениями, подлежащими сносу. Согласно Протокола поручений рабочей комиссии от 13 сентября 2018 г., а также заявлений, поданных гражданами, в случае не приобретения ими самовольно занятых земельных участков, по результатам аукциона, они обязуются произвести снос капитальных (некапитальных) строений, находящихся на земельных участках, в течение месяца с момента подписания протокола проведения аукционных торгов за счет собственных средств				
1	Участок № 92 к/н 321084800019000080, площадь 0,1493 га Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,1493 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0084 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей); 0,0494 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в санитарно-защитных полосах водоводов)	9 585,06	1122,58	959,00
2	Участок № 57 к/н 321084800019000081, площадь 0,1003 га Ограничения (обременения) прав на земельный участок: на площади 00,1003 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов)	6 439,26	1120,07	644,00
3	Участок № 100 к/н 321084800019000079, площадь 0,0585 га Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади: 0,0585 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0029 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт); 0,0017 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт)	3 755,70	1036,90	376,00

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: Управление землеустройства Гомельского районного исполнительного комитета, г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок 8 0232 53 15 21.

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY21302 УНП 400178549. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123, тел. 53 15 21. Дата и время начала и окончания приема заявлений **1.02.2019 по 4.03.2019 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00**.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы. Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомится с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону – 53 15 21.

*первоначальная цена предмета аукциона может быть изменена при изменении курса доллара на дату принятия решения

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«ВМЕСТЕ ПО СКАНДИНАВИИ – 2»

1. Сведения об организаторе:

1.1. Наименование - Общество с ограниченной ответственностью «Еврофасадсервис» (ООО «Еврофасадсервис») УНП 190797364, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета № 146 от 26 января 2007 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190797364.

1.2. Местонахождение организации:

1.2.1. Юридический адрес: г. Минск, ул. Машиностроителей 13, кабинет 3;

1.2.1. Почтовый адрес: 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей 13.

2. Наименование рекламной игры – «Вместе по Скандинавии – 2». Свидетельство № 3352 о государственной регистрации рекламной игры «Вместе по Скандинавии – 2», зарегистрированной 10 августа 2018 г.

3. Территория проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Сроки проведения рекламной игры:

4.1. Срок начала рекламной игры: 27 августа 2018 г;

4.2. Срок окончания рекламной игры: 28 февраля 2019 г.

5. Розыгрыш приза проводился 31 января 2019 года г. в 14.00.

6. Количество участников рекламной игры 672 человек.

7. Сведенья о победителях и выигрыше:

Призовой фонд в размере 1 157,03 (одна тысяча сто пятьдесят семь) рублей 3 копейки был разыгран полностью.

8. Информация о победителях представлена в таблице.

	Ф.И.О.	Приз
1	Родригес Алексей Хосеевич (номер купона 12-3415)	Сертификата на поездку в экскурсионный тур по Скандинавии **на двоих человек стоимостью 849 руб. 47 коп. и денежная часть приза в размере 110 руб. 35 коп. для уплаты подоходного налога.** Описание призового фонда: в стоимость тура входит: проезд автобусом Минск – Рига-Стокгольм – Турку – Хельсинки – Таллинн – Минск, проезд на пароме по программе, ночлег на пароме (2 ночи), экскурсионная программа в Риге, Стокгольме, Турку, Хельсинки, Таллинне. В тур не входит: питание, входные билеты, ужины на пароме, консульский сбор (оформление визы), медицинская страховка
2	Васильев Иван Александрович (номер купона 209-7660)	Мобильный телефон Lenovo Vibe C (A2020) 8 Gb стоимостью **186 коп. 00 коп. и денежная часть приза в размере 11 руб. 21 коп. для уплаты подоходного налога**

Телефоны для справок:

(городской) 388-10-60, (мобильный) 8 044 789 19 40, время работы с 9.00 до 18.00, за исключением выходных и праздничных дней

У суд Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні памерлым Жука Генадзя Паўлавіча, 25 верасня 1964 года нараджэння, ураджэнца вёскі Гурка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Апошняе вядомае месца жыхарства – вёска Заказель, вул. Партызанская, д. 53.

Просім усіх, хто ведае аб лёсе Жука Генадзя Паўлавіча і яго месцы знаходжання, на працягу двух месяцаў паведаміць у суд Драгічынскага раёна

Извещение о проведении электронных торгов

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 12 марта 2019 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб.	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, на участке № 6 по экспликации градостроительного проекта детального планирования промзоны 205ПЗ (в районе ул. Горецкого)	500000000006008888	2,1000	Для строительства объекта производственного назначения на участке № 6 по экспликации градостроительного проекта детального планирования промзоны 205ПЗ / земельный участок для размещения объектов иного назначения	386 503,25	57 900,00	12 630,85	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка – для строительства объекта производственного назначения; состав объекта – в соответствии с технологическими требованиями; показатели по вместимости объекта строительства – до 10500 кв. м
2	г. Минск, в границах жилого квартала «Магистр»	500000000009006706	1,3021	Для строительства объекта «Физкультурно-оздоровительный комплекс по генплану № 62 в границах жилого квартала «Магистр» / земельный участок для размещения объектов физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения	609 378,71	91 400,00	8 276,14	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса; общая площадь здания – 8 800 кв. м ориентировочно, но не более 9 390 кв. м, количество единовременных посетителей – 370 человек, строительный объем здания – 54 450 куб. м
3	г. Минск, ул. Каруся Каганца	500000000003005097	1,4000	Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса / земельный участок для размещения объектов физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения	566 651,12	85 000,00	9 522,40	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса; общая площадь зданий – до 8500 кв. м
4	г. Минск, ул. Михаила Пташука	500000000003005120	1,1500	Для строительства объекта «Многоуровневая автостоянка с объектами обслуживания по ул. Михаила Пташука (ул. Проектируемая № 4)» / земельный участок для размещения объектов иного назначения	411 286,84	62 000,00	9 160,84	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами – общая площадь зданий до 18000 кв. м, функциональное назначение объекта – многоуровневая автостоянка с объектами обслуживания, состав объекта: многоуровневая автостоянка минимум 400 машино-мест (13500 кв. м), объекты общественного назначения для обслуживания населения до 25 % общей площади (4500 кв. м) – предприятие автосервиса по ремонту и техническому обслуживанию легковых автомобилей не более 10 постов (СТО, мойка); административные, торговые и складские помещения
5	г. Минск, ул. Некрашевича	500000000005008212	0,2100	Для строительства объекта торгового назначения по ул. Некрашевича в г. Минске / земельный участок для размещения объектов розничной торговли	63 628,49	9 500,00	8 971,56	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка – для строительства объекта торгового назначения, состав объекта строительства – продовольственный магазин (до 400 кв. м торговой площади)

Продавец: Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

Порядок проведения электронных торгов: электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах **– 05.03.2019 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов**: 12 марта 2019 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

Размер штрафа, уплачиваемого участником повторных электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:

по земельному участку для строительства объекта производственного назначения на участке № 6 по экспликации градостроительного проекта детального планирования промзоны 205ПЗ (в районе ул. Горецкого) в г. Минске – **57 900,00** руб. (пятьдесят семь тысяч девятьсот бел. руб.);

по земельному участку для строительства объекта «Физкультурно-оздоровительный комплекс по генплану № 62 в границах жилого квартала «Магистр» в г. Минске – **91 400,00** руб. (девяносто одна тысяча четыреста бел. руб.);

по земельному участку для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса по ул. Каруся Каганца, г. Минск – **85 000,00** руб. (восемьдесят пять тысяч бел. руб.);

по земельному участку для строительства объекта «Многоуровневая автостоянка с объектами обслуживания по ул. Михаила Пташука (ул. Проектируемая, № 4)» – **62 000,00** руб. (шестьдесят две тысячи бел. руб.);

по земельному участку для строительства объекта торгового назначения по ул. Некрашевича в г. Минске – **9 500,00** руб. (девять тысяч пятьсот бел. руб.).

Прием заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется **по 05.03.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» **(http://minskestate.by)**

Наведвальнікаў музея Далі сустрэне віртуальны клон мастака

Гэтай вясной наведвальнікаў музея Сальвадора Далі ў амерыканскім Сент-Пітэрсбергу (штат Фларыда, ЗША) будзе чакаць унікальны «гаспадар». У рамках выстаўкі Dali Lives, якая адчыніць свае дзверы ў красавіку, усіх гасцей музея будзе сустракаць інтэрактыўная штучна-інтэлектуальная копія вялікага іспанскага мастака-сюррэаліста.

Музей аснасціць вялікімі лічбавымі экранамі, на якіх па націску кнопкі будзе «матэрыялізавацца» лічбавая копія жывапісца ў поўны рост і расказваць пра прадстаўленыя на выстаўцы творы мастацтва. Ідэя рэалізацыі гэтага праекта прыйшла на хвалі растучай сусветнай цікавасці музеяў да трэндаў сучасных тэхналогій, з дапамогай якіх арганізатары выставак спрабуюць прыцягваць новых наведвальнікаў.

Музей запрасіў каманду прафесіяналаў з Goodby Silverstein & Partners, якая выкарыстала відэазапісы з Далі, каб навучыць штучны інтэлект імітаваць міміку мастака, а затым наклала гэты эфект на акцёра з падобным целаскладам. Віртуальны мастак будзе каментаваць як уласныя творы, так і падзеі, якія адбыліся пасля яго смерці ў 1989 годзе. Штучны інтэлект — лічбавы клон Далі — павінен адначасова выконваць адукацыйную місію і пры гэтым быць такім жа сюррэалістычным, як і яго творы.

Вынік атрымаўся неадназначны, піша Engadget. Голас, як і варта было чакаць, адрозніваецца ад арыгінала, але вонкавае падабенства проста дзівоснае — перад вамі Сальвадор Далі ў самым росквіце сіл. Варта дадаць, што голас лічбавай версіі мастака прайграваецца пры дапамозе асобнай маўленчай платформы VoCo, якая раней была прадстаўлена кампаніяй Adobe. Некаторым прыхільнікам творчасці вялікага сюррэаліста можа не спадабацца ідэя музея, як, напрыклад, меламанам, якія пярэчылі супраць галаграфічных ураскрашэнняў легендарных спевакоў. Самі супрацоўнікі музея сцвярджаюць, што штучны інтэлект адпавядае асобе Далі, які цікавіўся медыя і меў «вострае пачуццё ўласнага вечнага значэння».

Англічане засмечваюць Тэмзу наркотыкамі

Мясцовыя навукоўцы зусім нядаўна рабілі замеры, якія паказалі: лонданцы багата засмечваць сваю раку наркатычнымі рэчывамі.

Пробы вады каля сцёкаў будынка парламента пацвердзілі, што канцэнтрацыя наркотыкаў у рацэ ўвесь час расце. І колькасць кафеіну, какаіну і бензаілэкганану (прадукту метабалізму какаіну) у вадзе, якая паступае на ачышчальныя станцыі Лондана, перавышае мікраграм на літр.

Усе гэтыя рэчывы выводзяцца з арганізмаў жыхароў Лондана, якія ўжывалі какаін, з мачой і праз каналізацыю паступаюць у воды Тэмзы. Вынікі даследавання, апублікаванага ў часопісе Science of The Total Environment, аказаліся не занадта суцяшальнымі. Калі ў іншых гарадах Брытаніі канцэнтрацыя наркотыкаў у вадзе падала хаця б па працоўных днях, то ў Лондане яна толькі расце — і ў святы, і ў будні! Вось у такім «развяселеным кактэйлі» даводзіцца плаваць насельнікам рачных вод. Навукоўцы адзначаюць, што ўсе гэтыя рэчывы выклікаюць у вугроў, якія жывуць у Тэмзе, неўласцівую ім актыўнасць. Какаін можа назапашвацца ў іх тканках, а таксама парушаць працэс назапашвання тлушчу, неабходнага вуграм для размнажэння.

Раней праведзеныя даследаванні паказалі, што менавіта сёння Лондан лідзіруе ў Еўропе па ўзроўні спажывання какаіну, прычым па хуткасці дастаўкі гэты «прадукт» апярэджвае нават піцу.

УСЁВІДУШЧАЕ ВОКА

Чаго вы не ведалі пра відэаназіранне

Відэаназіранне — гэта эфектыўны спосаб кантролю за кватэрай, домам, аб'ектам бізнесу і грамадскай бяспекай. Сучасныя камеры маюць неабмежаваныя магчымасці для сачэння, дзякуючы чаму ўладальнік сістэмы ў курсе любых падзей.

У творы сваіх кліентаў углядаюцца больш за тры мільёны банкаматаў. Дзясяткі тысяч прылад аўтаматычнага распазнавання аўтамабільных нумароў устаноўлены на магістралях. Колькі людзей носяць нагрудныя відэарэгістратары, невядома, але такіх таксама становіцца ўсё больш — і гэта не толькі прадстаўнікі праваахоўных органаў, але і кантралёры ў грамадскім транспарце, супрацоўнікі бальніц і іншыя. Расце колькасць і персанальных прылад сачэння — аўтамабільныя відэарэгістратары, камеры на шлемах веласіпедыстаў, дамафоны з відэакамерай.

Відэаназіранне — гэта самы хуткарослы сегмент на рынку сістэм бяспекі. Па розных ацэнках, штогод ён будзе дадаваць па 16 % у год і да 2020-га яго аб'ём дасягне 70 мільярдаў долараў. Дакладную колькасць камер, устаноўленых па ўсім свеце, не бярэцца падлічыць ніхто. Тым часам, паводле некаторых ацэнак, штогод у свеце прадаецца 106 мільёнаў новых камер відэаназірання.

Характэрна, што большая частка прылад знаходзіцца ў азіяцкіх краінах. Аднак, нягледзячы на гэта, самым кантраляваным горадам планеты з'яўляецца Лондан, укараненне відэасістэм у якім пачалося яшчэ ў 60-х гадах. А сёння сярэднестатыстычны жыхар Лондана трапляе ў аб'ектыў відэакамер да 300 разоў у суткі. Дарэчы, менавіта ў сталіцы Англіі ў ліпені 1960 года былі ўстаноўлены дзве першыя ў свеце камеры відэаназірання, задачай якіх быў кантроль на Трафальгарскай плошчы за натоўпам, які прыйшоў назіраць за афіцыйным візітам тайскай каралеўскай сям'і.

Зразумела, не толькі супраць тэрарыстаў і іншых злачынцаў паліцыя змагаецца з дапамогай сістэм відэаназірання. Ёсць задачы і прасцейшыя, якія выклікаюць немалы грамадскі рэзананс. Напрыклад, не так даўно ў Лондане выкід смецця з акна аўтамашыны стаў каштаваць буйным штрафам. Усім аўтаўладальнікам сталіцы туманнага Альбіёна зараз прыходзіцца плаціць штраф, калі сам кіроўца ці хто-небудзь з пасажыраў выкіне праз акно машыны смецце. Такія парушэнні фіксуюцца відэакамерамі, якія размешчаны ўздоўж практычна ўсіх англійскіх аўтастрад. Штраф прыходзіць па пошце, і не мае значэння, хто менавіта выкідваў смецце, таму што адказнасць кладзецца непасрэдна на ўладальніка аўто. Дарэчы, мінімальная сума за выкінутае з акна аўто смецце — 100 фунтаў — гэта амаль 290 беларускіх рублёў! У полі зроку мільёнаў відэакамер, устаноўленых у Вялікабрытаніі, — таксама няправільна прыпаркаваныя аўтамабілі і нават... кучкі, якія застаюцца на газонах пасля сабак. Таму некаторыя англічане скардзяцца, што мясцовыя ўлады выкарыстоўваюць камеры, каб пераследаваць іх за дробныя і нават ілюзорныя правапарушэнні.

Між тым Вялікабрытанія стане першай краінай у свеце, дзе неўзабаве будуць фіксавацца практычна ўсе перамяшчэнні аўтамабільнага транспарту. Выкарыстоўваючы сетку камер, якія аўтаматычна счытваюць нумарныя знакі ўсіх машын, якія праязджаюць міма, плануецца стварыць велізарную базу даных перамяшчэнняў аўтатранспарту, для таго каб паліцыя і службы бяспекі маглі аналізаваць любую паездку, зробленую кіроўцам на працягу некалькіх гадоў.

У цяперашні час сістэмы відэаназірання сталі даваць не толькі стандартныя магчымасці прайгравання і запісу відэапатоку з камеры. Яны дазваляюць у аўтаматычным рэжыме вырашаць мноства задач без удзелу чалавека, пачынаючы ад простага дэтэктавання руху ў зоне назірання, заканчваючы высокадакладным падлікам машын, якія праехалі, або людзей, якія прайшлі (сістэма падліку наведвальнікаў).

Два аператары працуюць у дыспетчарскай сістэмы відэаназірання Лонданскага раёна Ісліngтана, куды паступаюць сігналы са шматлікіх вулічных камер. Дзякуючы развітой гарадской сістэме відэаназірання атрымалася знайсці вінаватых у тэрактах 2005 года, калі загінулі 52 чалавекі.

— Першая ў свеце сістэма відэаназірання была створана ў Германіі кампаніяй Siemens у 1942 годзе для назірання за выпрабаваннямі ракет «Фау-2» на палігоне Пенемюндзе.

— У 1949 годзе быў апублікаваны фантастычны раман Джорджа Оруэла «1984», у якім аўтар апісваў масавае выкарыстанне відэаназірання задоўга да яго распаўсюджання.

— У 1956 годзе ў Гамбургу (Германія) паліцыя правяла выпрабаванні вулічнай сістэмы відэаназірання, названай Zauberspiegel («чароўнае люстэрка»).

— Відэакамера ў прыватным доме, кватэры або пад'ездзе шматпавярховіка павышае раскрывальнасць злачынстваў да 50 %.

— Большасць відэакамер, устаноўленых у свеце, з'яўляюцца аналагавымі.

— 10 мая 1997 года ў Брайтане (Вялікабрытанія) адбыліся першыя акцыі пратэсту супраць масавага відэаназірання.

— У Вялікабрытаніі на кожныя 11—14 чалавек прыходзіцца адна камера відэаназірання.

— У 1998 годзе ў лонданскім раёне Ньюэм упершыню ўстаноўлена сістэма распазнавання твараў. У 2000-х гадах яна дазваляла ідэнтыфікаваць твар чалавека з дакладнасцю, не меншай за 80 %.

— Самымі папулярнымі мадэлямі камер з'яўляюцца прылады кітайскай кампаніі Hikvision.

Бостанская кампанія Shooter Detection Systems распрацавала насценны прыбор (уверсе), які дапаможа выявіць у будынку стралка. Сістэма абсталявана праграмай, якая распазнае гукі стрэлаў, а інфрачырвоныя дэтэктары рэагуюць на дульнае полымя.

Наведванне пірамід — пустая трата часу?

Мільёны людзей у 2007 годзе прагаласавалі за тое, каб зрабіць егіпецкі комплекс пірамід Гізы адным з сямі цудаў свету.

Зразумела, пасля гэтай падзеі пабываць у старажытных славутасцях Егіпта пажадаў практычна кожны аматар падарожжаў, які наведаў гэтую краіну. Магчыма, гэта не самая лепшая задума: паводле слоў журналіста выдання Business Insider, наведванне старажытных пірамід — гэта вельмі сумны і нават пакутлівы занятак. У доказ сваіх слоў ён прывёў вельмі пераканаўчыя аргументы.

Першым месцам, якое наведаў журналіст, стала Чырвоная піраміда ў некропалі Дахшур. Яна атрымала такую назву з-за знойдзеных у ёй чырвоных вапняковых камянёў. Каб увайсці ў яе, патрабуецца толькі купіць білет у комплекс, у той час як для наведвання іншых пірамід акрамя асноўнага білета трэба купляць дадатковы коштам да 15 долараў.

Перад тым як наведваць піраміды, неабходна памятаць, што гэта грабніцы для захоўвання цел фараонаў-нябожчыкаў і абароны іх багацяў. Яны не былі прызначаныя для наведвання жывымі людзьмі, так што ні пра якія зручныя лесвіцы не можа быць і гаворкі. Каб трапіць у галоўны пакой са ступеньчатай столлю вышынёй да 12 метраў, неабходна прайсці праз вузкі праход. Трэба быць гатовым да таго, што насустрач могуць трапіцца турысты, якія вяртаюцца вонкі, — клаўстрафобам гэты шлях наўрад ці спадабаецца.

Паводле слоў вандроўніка, нягледзячы на халоднае надвор'е звонку, у сярэдзіне пірамідыне звычайна горача і душна. Плюс да ўсяго ў паветры лунае настолькі моцны пах цвілі, што людзям даводзіцца прыкрываць насы шаліkамі. Усё, на што можна паглядзець унутры, — гэта пустыя пакоі і праходы, сцены якіх пакрытыя графіці даследчыкаў і раскрадальнікаў магільняў. Ніякіх цікавых артэфактаў унутры няма, таму што яны альбо ўкрадзеныя, альбо захоўваюцца ў музеях.

Паводле слоў іншых турыстаў, такая ж пустэча пануе і ў іншых пірамідах. Адзінае адрозненне — іх наведваюць значна больш людзей. Магчыма, яны чакаюць чагосьці большага, бо за ўваход патрабуюць куплі дадатковага білета.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ВЯСНА ПАДНЯБЕСНАЙ

У Кітаі набліжаецца 4717 год

Ужо люты настаў, а чарада свят усё працягваецца: днямі ў Паднябеснай адзначылі «сяанянь» — малы Новы год. А ў наступны аўторак у Кітай прыйдзе вясна. Дакладней «Чуньцзэ» — Свята вясны. Так рамантычна тут называюць пачатак новага года. Сёлета гэта 4717-ты. І адзначаць кітайскі Новы год будуць не толькі на яго «радзіме», а і без перабольшвання па ўсім свеце. Як паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа», са спасылкай на міністра культуры і турызму Кітая Ло Шугая, у межах глабальнага праекта «Вясёлае Свята вясны» сёлета мяркуецца правесці больш чым 1500 адметных мерапрыемстваў у 396 гарадах 133 краін і рэгіёнаў. Да святкавання актыўна далучылася і Беларусь. Чым жа адметнае Чуньцзэ і як правільна «гукаць вясну» ў лютым?

Жоўты імператар

Кітайскі каляндар, які папулярны таксама ў Камбоджы, Манголіі, В'етнаме і іншых азіяцкіх краінах, уяўляе сабой цыклічную сістэму з 60-гадовым цыклам. Такая «схема» грунтуецца на... астранамічных цыклах Юпітэра. На працягу 60 гадоў гэтая планета робіць пяць абаротаў вакол Сонца. Зыходзячы з гэтага азіяцкія астролагі падзялілі шлях Юпітэра на 12 частак. Дні пазначаліся камбінацыяй з дзесяці знакаў, так званых «ствалоў», у якія ўваходзілі пяць «зямных стыхій» — дрэва, агонь, зямля, метал, вада. Гэтыя знакі яшчэ класіфікуюцца па прыкметах «ян» (мужчынскі) і «інь» (жаночы), а таксама па 12 «галінах», якія пазначаліся задыякальнымі сімваламі жывёл.

У адпаведнасці з кітайскай традыцыяй гады адлічваюцца ад пачатку праўлення Хуан-дзі — з 2698 года да н. э. Такім чынам і атрымліваецца, што сёлета наступае 4717-ты. Хуан-дзі, або Жоўты імператар, — легендарная асоба, ён лічыцца заснавальнікам даасізму і — ні больш, ні менш — першапродкам усіх кітайцаў. Прынята лічыць, што жоўты колер суадносіцца з характэрным адценнем вады ракі Хуанхэ. Цікава, што гэты колер у Кітаі стаў імператарскім, кіраўнік насіў адзенне залаціста-жоўтага колеру, на спіне звычайна вышываўся залатымі ніткамі іншы сімвал імператарскай улады — лун, які з'яўляецца адначасова і адным з рачных божастваў.

Хуан-дзі пасля цяжкай барацьбы здолеў падпарадкаваць сабе правадыроў асобных плямёнаў і стварыў першую кітайскую дзяржаву ў гарах Куньлунь — на захад ад ракі Хуанхэ. Усталяваўшы мір, Жоўты імператар прынёс ахвяры багам, прызначыў чыноўнікаў-кіраўнікоў і ўвёў першыя ў краіне законы. Усяго Хуан-дзі меў 25 сыноў, 14 з якіх сталі родапачынальнікамі вядомых кітайскіх кланаў. Яму прыпісваецца вынаходства сякеры, лодкі і вёслаў, ступкі і таўкачыка, лука і стрэл, сукенкі і туфляў, а таксама падзел зямлі на надзелы. Яго паплечнікі стварылі іерагліфічную пісьменнасць і каляндар. Хуан-дзі прыпісваюць аўтарства многіх класічных твораў, у тым ліку асноватворных медыцынскіх трактатаў Хуан-дзі Нэй цзін, а таксама кароткага сачынення ў вершах Іньфуцзін, ушанаванага ў даасізме. Прывязку да легендарнага імператара мае таксама «Жабіны канон», які змяшчае прадпісанні па акупунктуры і лячэнні прыпяканнямі.

Дасюль захаваўся маўзалей Хуан-дзі — месца, дзе быў пахаваны легендарны Жоўты імператар. Ён размешчаны за 140 кіламетраў па аўтатрасе на поўдзень ад цэнтра гарадской акругі Яньань правінцыі Шэньсі. Маўзалей з'яўляецца адным з першых аб'ектаў, якія былі ўключаны ў спіс ахоўваемых аб'ектаў культурнай спадчыны Кітая. Ён складаецца з дзвюх частак — Храма Хуан-дзі і залы маўзалея. Паводле легенды, імператар узышоў на неба, таму ў маўзалеі захоўваюцца толькі яго адзенне і капялюш. Шматлікія кіраўнікі Кітая са старажытных часоў прыязджалі сюды ўшанаваць Хуан-дзі.

У 2637 годзе да н. э. на загад заснавальніка кітайскай цывілізацыі ўсталявалася сістэма летавылічэння, у якой базавым стаў поўны 60-гадовы цыкл. Падчас Сіньхайскай рэвалюцыі ў 1911-м кітайцы перайшлі на еўрапейскую сістэму, але, нягледзячы на гэта, дагэтуль выкарыстоўваюць старажытны каляндар.

Тры мільярды пасажыраў

Цягам тысячагоддзяў у Паднябеснай і па ўсім свеце адзначаецца Свята вясны. Штогод дата Чуньцзэ змяняецца, паколькі вызначаецца выключна па месяцава-сонечным кітайскім календары. Адсюль і другая назва — месяцавы Новы год. Пачатак святкавання прыпадае на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння і таму перамяшчаецца ў межах месяца — паміж 21 студзеня і 21 лютага. Сёлета Свята вясны адзначаюць з 5 да 20 лютага, пры гэтым афіцыйныя выхадныя ў кітайцаў будуць доўжыцца ўвесь наступны тыдзень..

Чуньцзэ — сямейнае свята. Мільёны жыхароў Паднябеснай вяртаюцца ў свае родныя мясціны, каб сустрэць Новы год з сям'ёй. Сезон такіх паездак у Кітаі атрымаў адмысловую назву «чун'юнь» і лічыцца найбуйнейшай у свеце міграцыйнай з'явай. Як паведаміла «Жэньмінь жыбаа» анлайн, паводле інфармацыі намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта КНР па справах развіцця і рэформаў Лянь Вэйляна, сёлета падчас вакацый з нагоды Чуньцзэ будзе перавезена каля трох мільярдаў пасажыраў. Уяўляеце сабе «навагодні трафік»!

Цяпер у Паднябеснай час «суботнікаў» — кітайцы павінны прыбраць свой дом напярэдадні свята, прычым робяць яны гэта грунтоўна. Пасля таго як дом вычышчаны, усе мяцёлкі, саўкі, анучы прыбіраюцца ў месца, дзе б іх ніхто падчас свята не змог убачыць. Падчас Чуньцзэ займацца ўборкай непажадана. Паводле народных легендаў, перад наступленнем Новага года богі дораць людзям удачу, якая асядае ў выглядзе пылу. Вось і атрымліваецца, што, прыбіраючы ў гэтыя дні, вы рызыкуеце спудзіць поспех.

Перад святам краіна літаральна расцвітае кумачом. Паўсюль вісяць плакаты з вытанчана выпісанымі на іх іерогліфамі «фу» (шчасце) і «сі» (радасць), гірлянды ліхтароў і іншыя ўпрыгажэнні, і ўсе яны — выключна чырвонага колеру, які азначае поспех і дабрабыт. На дзвярах жыхары наляпляюць парныя каліграфічныя надпісы, выкананыя чорнай тушшу на чырвонай паперы. Змест зводзіцца да выказвання жыццёвых ідэалаў гаспадара хаты або добрых пажаданняў на новы год. На дзверы наляпляюць таксама выявы духаў-ахоўнікаў і божаства багацця ў надзеі, што яны прынясуць у хату шчасце і дабрабыт.

Пельмені і мандарыны

У нашы дні святочны вечар напярэдадні Свята вясны ў Кітаі немагчыма ўявіць сабе без прагляду традыцыйнага навагодняга галаканцэрта на тэлеканале CCTV. На змену традыцыйным званкам з віншаваннямі і паштоўкам прыйшлі тэкставыя паведамленні па месенджары WeChat (самая папулярная мабільная праграма ў Кітаі). Ноч пад кітайскі Новы год называюць таксама «ноччу сустрэчы пасля расстання». Для кітайцаў гэта самы важны момант. Уся сям'я збіраецца за святочным сталом да навагодняй вячэры, якая адрозніваецца не толькі багаццем і разнастайнасцю страў, але і старадаўнімі традыцыямі. Напрыклад, меню не абыходзіцца без страў з курынага мяса, рыбы і «доўфу» — соевага тварагу (у нас яго называюць «тофу»), бо ў кітайскай мове назвы гэтых прадуктаў сугучныя са словамі, якія азначаюць «шчасце» і «дабрабыт».

Паводле паданняў, у пачатку года ў кожны дом зазірае міфічная істота Нянь і знішчае запасы збожжа, жывёлу, а ў некаторых выпадках — нават дарослых і дзяцей. Таму ў першы дзень Чуньцзэ на ганку пакідаюць трохі ежы, каб задобрыць Няня і такім чынам адкупіцца ад яго. Па адной з легендаў, яшчэ ў старажытныя часы кітайцы аднойчы ўбачылі, як ненасытная істота спалохалася маленькага дзіцяці ў чырвонай вопратцы. Тады людзі вырашылі, што Нянь апасаецца гэтага колеру, і з тых часоў падчас Свята вясны яны апранаюць нешта чырвонае. Акрамя таго, кітайцы з першага да апошняга дня святкавання ўзрываюць феерверкі і петарды, каб гучным шумам адпудзіць злых духаў.

На Свята вясны ў Кітаі прынята абменьвацца падарункамі. Самым распаўсюджаным з'яўляецца чырвоны канверт з грашыма — «хунбаа». Яго прэзентуюць родным і сябрам, а таксама традыцыйна кіраўніцтва кампаній віншуе такім чынам сваіх падначаленых. Чырвоныя канверты — гэта не толькі грошы, але і пажаданне ўдачы і працвітання іх атрымальніку. З развіццём тэхналогій рабіць такія падарункі стала яшчэ прасцей. Той жа WeChat з 2015 года даў сваім карыстальнікам магчымасць адправіць грашовыя «хунбаа» ў асабістыя і публічныя чаты. У старадаўнія часы грошы дарылі ў выглядзе караляў, якія складаліся са ста манет. Гэта было своеасаблівае віншаванне — пажаданне пражыць да ста гадоў. Дарэчы, каралі са ста манет і сёння вельмі папулярныя ў Кітаі.

На поўначы Паднябеснай на Новы год прынята есці пельмені, а на поўдні — «няньгаа» (скрылькі, прыгатаваныя з клейкага рысу). Паўночнікі аддаюць перавагу пельменям, таму што на кітайскай мове слова «цзяацзы» сугучнае са словамі «праводзіны старога і сустрэча новага». Таксама лічыцца, што пельмені нагадваюць сваёй формай традыцыйныя зліткі з золата і срэбра і сімвалізуюць пажаданне багацця. З той жа прычыны жыхары поўдня ядуць «няньгаоа», якія сімвалізуюць паляпшэнне жыцця.

Падчас Кітайскага Новага года праводзяцца масавыя гулянні. Кітайцы пераапранаюцца ў львоў і драконаў, а таксама ладзяць свае знакамітыя выступленні ў маляўнічых касцюмах і на хадулях. Адзначаючы Свята вясны, прынята хадзіць у госці да сяброў, блізкіх і сваякоў і ўручаць падарункі ў чырвонай упакоўцы. Існуе традыцыя, паводле якой, прыходзячы ў госці на Новы год, трэба прыносіць два мандарыны. А падчас сыходу ўжо гаспадары аддаюць свае два мандарыны. Уся справа ў тым, што фраза «пара мандарынаў» на кітайскай гучыць практычна як слова «золата». І атрымліваецца, што такім чынам і госці, і гаспадары жадаюць адзін аднаму дастатку. Навагоднія святы сканчаюцца пасля свята Ліхтароў (Юаньсяацзэ або Дэнцзэ) — на пятнаццаты дзень першага месяца па месяцовым календары.

Нявеста ў арэнду

Такім чынам, 5 лютага наступае год Жоўтай Земляной Свінні. Падобная камбінацыя паўтараецца раз у 60 гадоў. Кожнае кола пачынаецца драўляным Пацуком. Апошняе такое пачало адлік 2 лютага 1984 года, яно завершыцца Вадзяной Свіннёй, гэта адбудзецца 29 студзеня 2044-га. Не многія ведаюць, што свіння патрапіла ў спіс жывёл задыякальнага календара выпадкова. Замест яе там павінен быў знаходзіцца кот, але ён спазніўся на імператарскі прыём, паколькі не быў пабуджаны пацуком.

У Кітаі ёсць такое паняцце, як benmingnian — так званы Год лёсу. Жыхары Паднябеснай вераць, што тым людзям, чый год наступіў, наканаваныя выпрабаванні і нечаканыя перамены. Як сцвярджаюць астролагі, асаблівай прыхільнасці гаспадыні года варта чакаць тым, чыя дзейнасць звязана з сельскай гаспадаркай, бо свінка любіць корпацца ў зямлі. Таксама 4717-ы спрыяльны для ўсіх, хто ўступае ў шлюб, і тых, хто імкнецца ўмацаваць адносіны ў сям'і.

У Кітаі лічыцца, што жанчынам належыць выйсці замуж да 30 гадоў, а мужчынам — ажаніцца да 32-х. Тыя ж, хто не створыць сям'ю да гэтага ўзросту, падвяргаюцца бязлітаснай крытыцы ў грамадстве. Ціск шматкроць узрастае падчас Чуньцзэ, паколькі Свята вясны спрадвеку лічылася выдатнай магчымасцю для адзінокіх знайсці сваё каханне. Менавіта таму ў гэты час узрастае попыт на паслугі «жаніх/нявеста напракат». Існуюць спецыяльныя вэб-сайты і агенты-пасярэднікі, якія спецыялізуюцца на гэтым бізнесе. У Taobao, найбуйнейшай у Кітаі інтэрнэт-краме, ёсць цэлы раздзел, звязаны з арэндай жаніха ці нявесты. Кошт паслугі — прыкладна 100 юаняў (16 долараў) у дзень. Але многія адзінокія кітайцы ўсё ж вераць: менавіта сёлета падчас «гукання вясны» пашчасціць адшукаць сваю палавінку. Год жа ўдалы.

Захар БУРАК.

«ГАЛОЎНАЕ — НЕ БЕГЧЫ ХУТКА ПЕРШЫЯ 100 КІЛАМЕТРАЎ...»

57-гадовы жыхар Ліды бегае сутачныя ультрамарафоны па ўсім свеце ў кедах айчыннай вытворчасці

Лявон АНАЦКА ніколі не займаўся прафесійным спортам, а ў 54 гады вырашыў паспрабаваць сябе ў сутачным бегу. Сёння ён наведаў больш за 15 краін, прыняў удзел у шасцідзесяці забегах і ўстанавіў рэкорд Беларусі ў шасцісутачным бегу. За 2018 год Лявон прайшоў ці прабег 3650 км, гэта, прыкладна, па 10 км кожны дзень. У інтэрв'ю нашай газеце ён расказаў, для чаго пераадольвае такія адлегласці і як падтрымлівае сябе ў форме.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Некаторыя лічаць мяне не зусім здаровым»

— Лявон, раскажыце, чаму менавіта ў 54 гады вы пачалі займацца бегам?

— Сябар яшчэ гадоў 10 таму запрашаў паўдзельнічаць у марафоне, а ў мяне то дзеці былі малыя, то бацькі хворыя, то работа. Пасля ён зноў звярнуўся з такой прапановай, прабегчы 42 км. Я кажу: неяк мала, каб сто якіх або суткі. А сам пра сябе думаю: які з мяне бягун? Вось у грыбы хаджу, на ровары езджу. За суткі добра натупаю. Чатыры гады таму ў Маладзечне быў забег у 100 км на 12 гадзін. Гарачынёй у 34 градусы вырашыў паспрабаваць сябе. За 12 гадзін натупаў 66 км і неяк не стаміўся. Украінец з гэтага забегу ў Маладзечне запрасіў мяне на сутачны забег у Кіеў, і я паехаў у сваіх лідскіх тапках, якія мы робім на фабрыцы. Хадзіў, хадзіў, і да раніцы 100 км нахадзіў. Пакуль маладыя набегаліся і спаць пайшлі ці на масаж, я далей хадзіў і выйшаў на шостае месца ў абсалюце, на другое ў сваім узросце. А пасля гляджу, яны ўжо прачнуліся і пачалі мяне даганяць, думаю, трэба і мне тады пабегаць, і так у мяне за суткі выйшла 136 км. Наступны старт, праз паўгода, быў ужо двое сутак, і так пайшло.

— А ў 2017 годзе вы ўжо ўзялі ўдзел у чэмпіянаце свету па сутачным бегу.

— Ён праходзіў у Белфасце, гэта была вельмі цікавая паездка, 500 удзельнікаў з розных краін свету. Я адзіны беларус, паехаў туды, не ведаючы мовы, і паставіў рэкорд — 165 км. У сваім узросце заняў чацвёртае месца. Пасля Белфаста ў мяне з'явілася думка, каб і ў Лідзе зрабіць такое свята, сабраць усіх гэтых спартсменаў. 27 верасня мінулага года ў Лідзе мы стварылі міжнародны клуб ультрамарафону (пакуль там толькі 16 чалавек, сярод іх беларусы, украінцы, расіяне і нават адзін афрыканец) і правялі падобны фестываль на адны, двое і трое сутак.

Ведаеце, некаторыя лічаць мяне нават не зусім здаровым, не разумеюць, як можна сто долараў аддаць і яшчэ двое сутак бегаць. Калі ты аддаеш грошы на цыгарэты або застолле, пасля якога яшчэ таблетак трэба купіць, гэта — нармальна, а калі траціш грошы, каб пабыць з людзьмі свайго складу мыслення, разважаюць вось так. За суткі, пакуль бяжыш, ты знаёмішся з людзьмі, можаш штосьці ім расказаць, падтрымаць адно аднаго. Ультрамарафон — гэта не толькі спаборніцтва, тут вырашальны, акрамя фізічнага стану, яшчэ і духоўны, эмацыянальны. Бо прабегчы 600 разоў па адным і тым жа кругзе не кожны вытрымае.

— Траса ультрамарафону заўсёды праходзіць толькі па стадыёне?

— Ёсць і больш цікавыя, складаныя — па перасечанай мясцовасці. Бяжыш ноччу, і ўсялякае можа здарыцца. Звычайна забегі праходзяць у нейкім адведзеным парку, дзе круг — паўтара кіламетра, на ім размешчаны палаткі ўсіх спартсменаў, тут можна схадзіць у прыбіральню, недзе адпачыць. Калі ўсе знаходзяцца ў адным месцы, гэта ўсё фіксуецца. Так больш надзейна, бо ўсе бачаць адно аднаго, калі штосьці здарылася, можна дапамагчы. І, вядома, лягчэй весці падлік.

Суткі — гэта афіцыйная дыстанцыя, але яе пакуль няма ў праграме Алімпіяды, хоць на Гульнях у Лондане была размова, каб уключыць сутачны бег у праграму.

«Няшчасны чалавек суткі не пабяжыць»

— Які асабісты рэкорд вы маеце сёння?

— 179 км, я пакрысе падрастаю, але, каб атрымаць першы разрад, трэба за суткі прабегчы 190 км, для кандыдата ў майстры спорту — 220 км, у майстра — 240 км. Але гэта ўжо для моладзі. Я кажу так: пакуль не прабягу ў Нью-Ёрку пяць тысяч км за 52 дні, ні пра якую хуткасць не думаю, проста працую на трываласць. Самае складанае ў пераходзе ад марафону да ультрамарафону — навучыцца бегчы павольна. Бо калі ў марафоне можна не есці, не піць — проста бегчы, то на сутачным марафоне так не вытрымаеш. Галоўнае, не бегчы хутка першыя 100 км, а далей усё пойдзе.

— Што паспяваеце зрабіць за гэтыя суткі, пакуль бежыце?

— У залежнасці ад таго, якая дыстанцыя. Калі гэта — чэмпіянат свету, то тут нічога не будзеш мудрыць: не спаць, і толькі наперад. Калі гэта шасцісутачны забег, тут можна трошкі з сапернікамі пагуляцца. Напрыклад, у Італіі я так і зрабіў. Там мне пашчасціла пабіць рэкорд Беларусі ў шасцісутачным забегу — 721 км.

Я прыехаў на гэты забег стомлены, бо прыляцеў за чатыры дні да старту. Прыляцеў у Рым, а забег быў у Палікора. Ну, думаю, як гэта быць у Італіі і не пабываць у Ватыкане. Пабываў, а потым з самымі таннымі білетамі на аўтобусах і цягніках, а недзе і пешшу, дабраўся да месца старту. Прыйшоў за дзве гадзіны да пачатку, ноч перад гэтым спаў на чыгуначным вакзале. Вядома, у першы дзень не змог хутка бегчы, таму пасля шасці гадзін на дыстанцыі вырашыў трохі паспаць. Такім чынам, у першы дзень прабег толькі 113 км, у адрозненне ад лідара, іспанца, які прабег 190 км. Я быў тады недзе 17-м з 30 удзельнікаў. На другі дзень ужо стаў 10-м, потым 6-м, 5-м і вось, у перадапошні дзень, падабраўся да гэтага іспанца і яшчэ на 20 км яго абагнаў. Я кажу гэта да таго, што трэба ўмець пакінуць сілы на апошні дзень і пралічыць, як будуць паводзіць сябе канкурэнты.

Зараз мне цікава паспрабаваць сябе ў дзесяцісутачным забегу ў Нью-Ёрку, я атрымаў запрашэнне на гэты марафон. Трапіць туды вельмі цяжка, запрашэнне абы-каму не дадуць, але арганізатары прааналізавалі маю статыстыку і вырашылі запрасіць. Зараз вырашаю пытанні з візай.

— Што вы б назвалі самым важным у ультрамарафоне?

— Каб чалавек быў станоўчы эмацыянальна. Заўсёды кажу: няшчасны чалавек суткі не пабяжыць.

Калі бяжыш ноччу, цяжка дачакацца ўзыхода сонца. Калі кладзешся спаць, самае складанае потым падняцца, арганізм ужо не хоча бегчы, пераламаць сябе вельмі складана.

«Багацеюць не прыбыткам, а расходам»

— Усе паездкі вы аплачваеце за свае грошы?

— Так, тыдзень таму я яшчэ быў рабочым лідскай абутковай фабрыкі, атрымліваў невялікі заробак, але жыву па такім прынцыпе — багацеюць не прыбыткам, а расходам, гэта і праўда так.

— Дарэчы, як трэба харчавацца марафонцу?

— Гарбату не п'ю, каву таксама. Кашы наеўся, цыбуляй закусіў. У маім звыклым рацыёне — разынкі, яблыкі, лімон, імбір. Магу з'есці мяса, але для марафонца лепей нават сала. Ужываю алей, цудоўная рэч для мяне — кефір, хлеб. Я адчуваю, што ў мяне ўсё працуе. Ежа — гэта вельмі важна, калі не працуе страўнік або працуе не так, як трэба, то ні да якога бегу няма спраў.

— Што вы звычайна бераце з сабой на забег?

— Спальнік, хлеб, соль, ваду, капусту, разынкі, імбір, мёд — усё натуральнае. Неяк не было ўжо чаго есці ў Капенгагене, гляджу — айва расце, а яе ніхто не збірае, я айвы набраў.

«Наша мова не горшая за іншыя, з ёй можна выжыць»

— Колькі краін вы ўжо аб'ездзілі?

— Вялікабрытанія, Грэцыя, Іспанія, Італія, Данія, Эстонія, Латвія, Польшча, Румынія, Малдова, Украіна, Расія, Літва, Венгрыя, Швецыя. Больш за ўсё спадабалася Данія, сціплая краіна з такой жа архітэктурай. Калі я падарожнічаю, стараюся рабіць не так, як нашы багатыя турысты, мяне не цікавяць пяцізоркавыя гатэлі. Так жыццё чужой краіны не ўбачыш. Я бяру заплечнік і іду па вуліцах, запытваюся ў людзей. Дарэчы, англійскай мовы не ведаю, да ўсіх звяртаюся на беларускай. Важна не тое, што мы гаворым, а тое — як мы гаворым. Наша мова не горшая за іншыя, з ёй можна выжыць.

— Як вы трэніруецеся?

— У мяне ўся трэніроўка заўсёды была ў працы. Я адзін будаваў хату, потым другую. Праязджаю на ровары каля 25 км, потым цэлы дзень іду па лесе, набіраю два вядры лісічак, назаўтра іх здаю. За дзень я мог зарабіць тыднёвы заробак на працы. Напрыклад, тыя ж ягады, калі было больш часу, вядро ягад я рукамі набіраў, мне гэта прыносіла задавальненне.

— У дзяцінстве спортам наогул не займаліся?

— Я шмат хварэў, да дзесяці гадоў некалькі разоў на запаленне лёгкіх. Потым, калі пайшоў у інстытут, пачаў загартоўвацца, абціраўся снегам, потым у палонцы купаўся. Цяпер па снезе басанож хаджу. З дзяцінства быў вельмі маленечкі, у 9 класе — 154 см. Мне параілі пайсці на лёгкую атлетыку. Два гады я пабегаў. За год на 12 см падрос, але спартыўных вынікаў не паказваў.

— Ці змянілася здароўе, калі пачалі займацца марафонам?

— Вядома, яно стала значна лепшым. За тры гады ў мяне каля 60 стартаў. Ні ў адным з іх я не перавышаў свае магчымасці. Я заўсёды адчуваю свой арганізм, слухаю яго, паважаю, гэта вельмі важна. Трэба слухаць сябе і не глядзець ні на кога. Гэта і ў бегу, і ў жыцці. Я ніколі не стаўлю будзільнікаў, нават калі трэба на самалёт. Мне нешта дапамагае, у сне я вырашаю многія свае задачы, кладуся спаць, і да мяне прыходзяць думкі, кажуць, гэта бацькі, дзяды і прадзеды нам дапамагаюць. Я ў гэта веру.

«За ўсё жыццё я выкурыў пачку «Космасу»

— Разумею, што дрэнных звычак у вас ніколі не было?

— Прызнаюся, некалі пасля школы курыў, за ўсё жыццё я выкурыў пачку «Космасу», тады гэта былі самыя дарагія цыгарэты. Хадзіў на танцы, віно нейкае пілі, але ў мяне да гэтага ніколі не было асаблівага жадання. На сённяшні дзень перад ядой магу трохі выпіць натуральнага віна, але ж не бутэльку.

— А якія звычкі ў вас сфарміраваў бег?

— Я цяпер больш па-філасофску гляджу на ўсё. Ведаю, куды б я ні паехаў, атрымаецца нават лепш, чым я планаваў, будзе не так, як я хацеў, можа — горш, але нешта будзе нашмат лепш, чым я думаў. Па жыцці я цяпер аптыміст.

— Ці падтрымлівае вас сям'я?

— Як я разумею, тут два моманты. Па-першае, дзеці лічаць, што тата не шануе сваё здароўе, а па-другое, што яму грошы дзяваць нямa куды. Але прама такое ў лоб яны мне не кажуць. Атрымліваецца, не надта падтрымліваюць, але і не перашкаджаюць.

— А як ставяцца да вашага захаплення аднагодкі, сябры?

— Трошкі з падазрэннем, а хтосьці і падтрымлівае. Я ўсім кажу: вы рабіце, як хочаце, галоўнае, каб маглі адчуваць сябе здаровымі, шчаслівымі, багатымі і пажадана ў канцы жыцця. І мама мая казала, не важна, як чалавек жыве, важна, як ён дажывае. Колькі мы пакінулі сабе здароўя, сродкаў, эмацыянальнага настрою.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МЗКТ» (продавец), расположенного в г. Лида, ул. Жукова, 1

Лот № 1, состав: 1. Столовая, инв. № 420/С-4449. Площадь – 3087,5 кв. м. 2. Ливневая канализация, инв. № 420/С-60930. 3. Хозяйственно-бытовая канализация, инв. № 420/С-60929. 4. Тепловая сеть с горячим водоснабжением, инв. № 420/С-60931. Пожарно-питьевой водопровод, инв. № 420/С-60927. **Начальная цена – 965 625,60 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Задаток – 96 562,56 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

Земельный участок 423650100001000988, 0,5690 га. Право постоянного пользования

Обременение: аренда до 02.10.2020, площадь – 135,2 кв. м

Аукцион состоится 04.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «МЗКТ», проводимом 04.03.2019. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 28.02.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Дранкович Александр Викторович, тел.: 8 015 46-5-26-01, 8 015 46-5-26-00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.09.2018

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ОАО «Пинск – стройматериалы» 14 и 26 февраля 2019 года проводит 10-е и 11-е открытые торги в форме аукциона по реализации имущества

Организатор торгов	Ликвидатор **ОАО «Пинск – Стройматериалы»,** Ребковец Дмитрий Павлович, тел.: +375 29 835 99 77; 44 776 19 47
Время и место проведения торгов	**В 11.00** по юридическому адресу продавца

Номер лота	Наименование и краткое описание	Общая площадь, кв. м	Стоимость, руб. без НДС	Размер шага аукциона, руб.	Начальная цена лота с учетом шага, руб., без НДС
1	Склад-арочник № 1, ул. Пучкова, 14В	**493**	**37 280**	**1864**	**39 144**
2	Склад-арочник № 2, ул. Пучкова,14Г	**493**	**45 380**	**2 269**	**47 649**
3	Навес для материалов, ул. Пучкова,14Д	**637,6**	**65 760**	**3 288**	**69 048**
4	Мастерские, ул. Пучкова,14Б	**146,1**	**17 400**	**870**	**18 270**
5	Склад-модуль, ул. Пучкова,14	**881,2**	**154 000**	**7 700**	**161 700**
6	Магазин № 30 «Стройматериалы», ул. Пучкова, 14	**602,5**	**243 200**	**12 160**	**255 360**
7	Магазин № 22 «Сделай сам», ул. Берковича, 13	**206,5**	**63 600**	**3 180**	**66 780**
8	Магазин № 4, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 39	**198**	**64 380**	**3 219**	**67 599**
9	Магазин № 15, ул. Горького, 57	**526,4**	**361 120**	**18 056**	**379 176**
12	Пилорама ленточная MG-6200		**3 575**	**179**	**3 754**
13	Станок 4-сторонний TOSSVITA		**17 235**	**862**	**18 097**
14	Станок заточной для дисковых пил ВЗ-464		**1 040**	**52**	**1 092**

Подробно с имуществом и условиями можно ознакомиться с пн. по пят. с 8.00 до 18.00 по адресу продавца, на сайтах **brest-region. gov.by**и у организатора торгов

Шаг аукциона	**5 % от начальной стоимости лота**
Размер задатка	10 % от начальной цены предмета торгов. Задаток до подачи заявления перечисляется на **р/с BY 39 PJCB3012 520004100000 0933 в Приорбанк ОАО БИК PJCBBY2X, УНН 200250973**
Документы, необходимые для участия в торгах	Заявление на участие в аукционе, платежный документ с отметкой банка о внесении задатка, копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов, предоставляются не позднее **10.00 в день проведения аукциона**
Возмещение затрат	Победитель (претендент) возмещает затраты, связанные с подготовкой по организации и проведению аукциона из расчета 1,85 % от суммы сделки без НДС, которые подлежат уплате в течение 3 (трех) рабочих дней с даты проведения аукциона

Открытый аукцион № 61/19 по продаже административного помещения банка по адресу: п. Колодищи, ул. Минская, 5

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс: + 375 (17) 256-61-35

Аукцион состоится 12.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

№ лота	Предмет аукциона	Местонахождение	Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, руб.	Сумма задатка по лоту, руб.
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-48151 площадью – 184,7 кв. м. Назначение – административное помещение. Наименование – банковское изолированное помещение № 4. **Банковское помещение**	Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Минская, д. 5, пом. 4	414 750 руб. 24 коп.	18 000

Порядок проведения и выбора победителя	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае, когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 06.03.2019 до 17.00**
Задаток	Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты: – для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22; – для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение платежа: «Задаток согласно извещению о проведении аукциона № 61/19»
Затраты	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 61/19. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.

Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.

3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА, тел.:+ 375 (17) 256-61-35 | + 375 (25) 549-86-22 – Игорь Садливский. auction@expertiza.by. Подробная информация у нас на сайте: http://www.expertiza.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Торговый дом «Речицкий» (продавец имущества) извещает о проведении 19 февраля 2019 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены более 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 300/С-58446**, площадью **785,8 кв. м;** назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **автостоянка.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000006000636** общая площадь – **0,3223 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Местонахождение: г. Гомель, пр-т Речицкий, 9 «Б». **Автостоянка в составе:** здание гаража (автостоянка) кирпичное по бух. учету № 030 площадью 455,8 кв. м; пристройка к гаражу (автостоянка) по бух. учету № 032 площадью 277,7 кв. м; пристройка к гаражу № 2 из гаража по бух. учету № 033 площадью 87,9 кв. м. Вагон-домик металлический по бух. учету № 031 площадью 23,8 кв. м. Навес № 1 для автомобилей из металлических туб, крытые шифером по бух. учету № 034 площадью 112,4 кв. м. Навес № 2 для автомобилей из металлических туб, крытые шифером по бух. учету № 035 площадью 156,2 кв. м. Навес № 3 для автомобилей из металлических туб, крытые шифером по бух. учету № 036 площадью 200,0 кв. м. Уборная из досок по бух. учету № 037 площадью 1,2 кв. м. Ворота эл. механические металлические по бух. учету № 0030 площадью 9,1 кв. м. Ворота металлические по бух. учету № 0031 площадью 8,6 кв. м. Мощение (асфальто-бетонная площадка) по бух. учету № 0032 площадью 1 652,0 кв. м. Забор железобетонный по бух. учету № 0033 площадью 336,8 кв. м. Мощение (откос мощеный бетонными плитами) по бух. учету № 0034 площадью 99,5 кв. м. Вольер для собаки (малоценный). Тревожная кнопка охранной сигнализации по бух. учету № 30020	121 106,56	12 110,66

Продавец: ОАО «Торговый дом «Речицкий», г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 46-42-71 – Пикулина Нина Альбертовна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Торговый дом «Речицкий»):** р/с BY56 BLBB 3012 0400 0540 0000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, код банка BLBBBY2X, УНП 400054000, ОКПО 14458671, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1. **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 февраля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 февраля 2019 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 15.06.2018 г. В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Посольство Бразилии в Минске

объявляет конкурс на вакантную должность работника сферы бытовых услуг (повар) со знанием португальского, английского или испанского языка, а также опытом работы в данной сфере. Срок подачи заявок – с 1 по 15 февраля 2019 г. Подробная информация по ссылке https://bit.ly/2MNPNF6.

УНП 102366923

Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков

Наименование объекта	**Лот № 1**	**Лот № 2**	**Лот № 3**
Целевое назначение	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома		
Местонахождение объекта	аг. Великорита, ул. Парковая, 1А	аг. Великорита, ул. Парковая, 1Б	д. Гусак, ул. Комсомольская, 5А
Продавец объекта	Великоритский сельский исполнительный комитет		
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет		
Начальная цена продажи, руб.	3780,00	3780,00	1875,00
Сумма задатка, руб.	378,00	378,00	1857,50
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер	0,2500 га, решение Великоритского сельисполкома от 12.09.2016 № 141. Кад. № 125280401601000240	0,2500 га, решение Великоритского сельисполкома от 12.09.2016 № 142. Кад. № 125280401601000241	0,2500 га, решение Великоритского сельисполкома от 05.11.2018 № 185. Кад. № 125280402101000349
Ограничения в использовании земельного участка	Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 0,2500 га	Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 0,2500 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне р. Рита) на площади 0,2500 га; в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0006 га
Вещное право, срок аренды земельного участка	Частная собственность		
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб.	153, 01	153, 01	1485,75
